«І гэта ўсё, што я займеў ад волі...» . . . . . . . . . . . . . . . 2

Мы сябе дакараем і ганім, вінавацім усіх запар — экс-кандыдатаў, цяперашніх і былых, быдлячую нацыю, пустэльню, з якое не з'яўляецца чамусь сапраўдны лідар. Мы захліпаемся слязьмі і абурэннем, але… Але пакуль не бачым, не адчуваем самага важкага: нас, тых, якімі былі да Плошчы-2010, больш няма.

«Працоўныя» моманты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

У пэўны момант я апынулася на ўжо «зачышчанай» тэрыторыі і зразумела, што ў такім вэрхале наўрад ці хто будзе глядзець на маю прэс-карту.

Журналісты сталі ворагамі? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

Тое, што журналістаў штурхалі, некаторых збівалі з ног, білі дубінкамі па галаве і па руках, яскрава сведчыць: салдаты ўнутраных войскаў і міліцыянеры, калі і мелі, то зусім не абарончыя інструкцыі ў дачыненні да прэсы.

№ 1 (88) 2011

# абажур

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS




**ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ!**

## Заява Рады ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»

*4 студзеня 2011 года*

Рада ГА «БАЖ» выказвае рашучы пратэст у сувязі з масавымі парушэннямі правоў журналістаў і СМІ на працягу апошняга месяца, пачынаючы з 19 снежня 2010 года. Пераследы за свабоднае выказванне меркавання і гвалтоўнае ўмяшанне ў рэдакцыйную дзейнасць некаторых выданняў працягваюцца і цяпер.

Парушэнні прафесійных правоў журналістаў адбыліся, нягледзячы на звароты арганізацыі да Генеральнага пракурора і кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства юстыцыі з заклікам забяспечыць законнасць у дачыненні да нашых калегаў.

## Беларускія журналісты перадалі міністру ўнутраных спраў супольны зварот

*26 студзеня 2011 года*

«Звароты журналісцкай супольнасці — не толькі беларускай, але і сусветнай — з мэтай забяспечыць выкананне заканадаўства аб СМІ і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь застаюцца непачутымі. Альбо на іх прыходзяць адказы (якія інакш як адпіскамі не назавеш), аўтары якіх не разумеюць існасці і спецыфікі журналісцкай дзейнасці»…

## БАЖ змагаецца за журналістаў

Кіраўнікі БАЖ перадалі адпаведным структурам паперы аб персанальным паручальніцтве за арыштаваную Ірыну Халіп. Таксама арганізацыя звярнулася да кіраўніцтва ГУУС з просьбай разгледзець пытанне аб змяненні меры стрымання журналістам і сябрам арганізацыі: Наталлі Радзінай, Дзмітрыю Бандарэнку, Сяргею Вазняку, Паўлу Севярынцу, Аляксандру Фядуту.



абажур
ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS
ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ!

***Выдавец:*** ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»
***Перыядычнасць:*** 1 раз у 2 месяцы
Выдаецца са снежня 2000 г.
№ 1 (88) 2011 г.

***Галоўны рэдактар***
Уладзімір Барысавіч Дзюба

***Фота***
Photo.bymedia.net,
Юліі Дарашкевіч, Вадзіма Заміроўскага,
Аляксея Мацюшкова, Аляксея Пілецкага

***На вокладцы –***
Фота Аляксея Мацюшкова

Выданне зарэгістравана
ў Міністэрстве інфармацыі
Рэспублікі Беларусь,
рэгістрацыйны № 833 ад 04.12.2009 г.

Падпісана да друку 31.01.2011 г.
Дата выхаду
Фармат 60х84 / 8.
Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк.
Наклад 700 асобнікаў.
Заказ №
Распаўсюджваецца бясплатна.

***Адрас рэдакцыі:***
***220030, г. Мінск,***
***вул. Камсамольская, 7–32.***
***Тэл./факс: (017) 203-63-66,***
***(029) 126-70-98***
***E-mail: abajur@baj.by,***
***baj@baj.by***
***Сайт: www.baj.by***

Друкарня СТАА «МЕДЫСОНТ»
ЛП № 02330/0150444 ад 19.12.2008 г.
Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Цімiразева, 9.
Тэл.: (017) 203-74-10, 203-53-41,
(029) 623-74-10
medisont@gmail.com
www.medisont.com

У адпаведнасці з Законам аб друку аўтары нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, прыведзеных у артыкулах.

Рэдакцыя можа публікаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў.

**«І гэта ўсё, што я займеў ад волі…»** . . . . . . . . . . . . . **2**
А. Хатэнка

**Маленькае «але…»** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **8**
Э. Мельнікаў

**АБ'ЕКТЫЎна** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **12**

**Тварам да сцяны** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **14**
К. Чарнец

**У грамадзян няма цікавасці** . . . . . . . . . . . . . . . . . . **22**
А. Смірноў

**Урок румынскай** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **23**
А. Дубравін

**Рандэву з быкамі** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **26**
К. Лашкевіч

**«Мяне ніколі не гвалтавалі. Але зараз я ведаю, што гэта такое»** . . . . . . . . . . . **28**
А. Якжык

**«Працоўныя» моманты** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **30**
В. Гарбузаў

**Журналісты сталі ворагамі?** . . . . . . . . . . . . . . . . . . **33**
Л. Лунёва

**RE-pressing: Захад шакаваны дзеяннямі беларускіх уладаў у дачыненні да журналістаў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **35**
Я. Мельнікава

**«Было вельмі цяжка…»** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **37**
А. Ксёнжык

**Па гэты бок Кратаў…** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **38**
В. Равінская

**«Я прыйшоў, каб вы ўдыхнулі волі!»** . . . . . . . . . . . **42**
С. Молатава

**За кулісамі «СБ»** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **44**
М. Аляксандраў

**А журыцца не варта!** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **48**
Г. Суднік

**Нават на самых аддаленых пашах Туркменістана слухаюць «Радыё Свабода»** . . . . **50**
Я. Мельнікава

**Эканамічная свабода** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **53**
Л. Заіка

**Віp** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **56**
Ю. Лабэцкі

**Каму ў Беларусі жыць добра** . . . . . . . . . . . . . . . . . **58**
М. Залескі

**Пра свінню ў год труса** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **60**
К. Скуратовіч

**Як Бог ствараў беларусаў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . **61**
А. Анціпенка

**Пяць навагодніх гісторый** . . . . . . . . . . . . . . . . . . **62**
С. Печанко

# «І гэта ўсё, што я займеў ад волі...»

**Людзі выйшлі на ўладны пляц, да свайго кіраўніцтва, не з дубінкамі й шчытамі, а ўсяго толькі з адкрытымі сэрцамі й сьцягамі этнічных колераў, якія, вядома ж, не маглі засланіць ад нападу, але ўжо самой прыналежнасьцю да векавой традыцыі й сьвятых Дзядоў надавалі магуты пачуцца разумнай часткаю нейкае супольнасьці.**

**Нас, тых, якімі былі да Плошчы-2010, больш няма.**




*І ўсё. І тое ж будзе потым,*
*як і раней, як перад тым:*
*адчай і боль з крывёй і потам,*
*як дым.*

*Уладзімер Някляеў*





Фота Сяргея Балая

*Антаніна*
*ХАТЭНКА*

І ўсё? — запытаньне колкае, як ацот, да самое сябе, да сьвету, да завейнай зямлі стрэмкаю засела недзе ў самай глыбіні сьвядомасьці. Не магу вымавіць, вызваліць яго з нутранога зьняменьня, што апанавала, здаецца, усю істоту. Выдыхнуць не магу. І што, зрэшты, азначае такое катэгарычнае слова «ўсё» — загубу ці паўнату разуменьня сябе й свайго дому на плянэце Зямля? Дому, які марыць пра лад, цеплыню й шчырасьць каторы век ужо, каторую пару...

Ведаю: гэта сон — маё здранцьвеньне. Гэта цяжкая навала сну, з-пад якога, як з-пад бела каменя, празрыста сочыцца жывая вада праўды. Тае праўды, якой шукаем у барацьбе, а сягаем толькі ў адзіноце, у адлучнасьці ад сябе саміх, спрутна ўмантажаваных у краты дзяржаўнай сыстэмы, што выварочвае, выломвае нас на ўсялякі капыл, каб дагадзіць самой сабе.

Так, дзяржава — гэтае спараджэньне несвабоднага розуму — і насамрэч ёсьць хіжым зьверам. Дык пра тое ж гэтак даўно й гэтак папераджальна сказаў Ніцшэ. Ды мы ўсё пнемся яе, дзяржаву, улагодзіць, ачалавечыць і прыцягнуць да прыродных людзкіх пачаткаў. Мы зьляночана ганарымся: дапялі, маўляў, дзяржаваўтварэньня. А насамрэч гэткае ўжо сягненьне — мецц над сабой няўсыпнае войска назіральнікаў-пільначоў і няўтомна ўскормліваць іхную хцівасьць!

...Аднак не трактат усё ж сабралася я пісаць пра пагібельнасьць дзяржавы. Карціць вылезьці з-пад цёмнае хмары безвыходнай злосьці ды ўбачыць Сонца, узьнесенае Калядой над цэлай плянэтай, над нашымі згрызотамі й змаганьнямі, над нашай журбой і самотай.

Вось-вось: *«Калісь глядзеў на сонцэ я. Мне сонцэ асьляпіло вочы»*... Максім Багдановіч прадчуў ледзь не за стагодзьдзе наперад сёньняшнюю нашу скрушнасьць. Такую скрутную скрушнасьць, што й сонца адно сасьляпляе, а не дае палёгкі. Але дарадзіў Паэт і паратунак з гэтае нязбыўнае маркоты: *«Ды што мне цемень вечнай ночы? Калісь глядзеў на сонцэ я»*.

Як угледзецца ў скрытнасьць прышэсьцяў нашых і сыходаў, зблудаў і спасьціжэньняў, то адкрыецца такая простая, але такая зьмірэнча сьветлая ісьціна: *«Адно і ёсьць — што лёс. А што бывае болей?»* Дык жа больш значнага за лёс нічога, папраўдзе, у нашых зямных падарожжах і не збываецца. І на лёсавых ростанках кожны з нас сам-насам апынаецца перад выбарам: з дабром ці зь ліхам, на супын ці на развой жыць, думаць і чыніць. Плошча-2010 якраз і раскрыла сярэдзінны зьмест таго, як і з чаго лепім мы свае лёсы й як уплываюць яны — крывяносныя сасуды Бацькаўшчыны — на агульны лёс тае краіны, куды прыходзім кожны са сваім перадвызначэньнем.

Напэўна ж, зьведаў Багдановіч, пасьпеў на кароткай сьцяжыне да Бога адчуць тую моц сьвятла, што здольна прабіць і камень, засяліўшыся ў чуйнае сэрца. І вось яно вястуецца да нас, зьняможаных пад карнай рукой спалоханага зласьліўца, нягаснае, неадольнае Сонца. Хто хоць аднойчы глядзеў на Сонца, глядзеў дзёрзка, адкрыта, зьнітавана зь ягонай магутай-памяцьцю, той робіцца сонцам сам. Той нясе скрозь жыцьцё палкае Сонца любові й адданасьці, той сьвеціць, не чакаючы адплаты ўзамен. І хіба гэтага мала, каб жыць і верыць, каб ісьці й пракладаць сьцяжыну далей? Хіба ня ўцешна ўсё-ткі спаўняць сваю місію, ведаючы й спазнаючы ўласную адзіноту перад абліччам драпежнай дзяржавы, заўжды гатовай заглынуць цябе й выплюнуць дзеля выгоды купкі ўладатрымцаў, ня здатных ні да якай місіі, акрамя як спажываць?

## «Спапяліўшы былое ў былым»

Скажаце: дык жа й дзяржаўныя мужы таксама свае імёны адбілі ў гісторыі, выконваючы ролі адважных абаронцаў і мудрых ачольнікаў краін. Надараецца й так. Бывае. Дзяржава — гэты ненажэрны людаед — ператвараецца ў рахманую котку, калі час вылучае са свайго бязьмежжа Павадыра й Думцу. Калі пастваа здольная пачуць — ня лаянку й посьвіст бізуна, але Слова, рух Духу. Ды каб такое супадзеньне адбылося, прайсьці трэба пакутны Шлях. Шлях сьпяленьня нацыянальнага ядра ў кратаваньнях чалавечай сквапы, зайздрасьці, ліслівасьці й здрадніцтва. Шлях спаленьня самасьці, якой спрадвек хочацца вяршэніць і загадваць, папікаць паслугачоў і прылашчваць лізуноў. А хто на такое здатны — адпрэчыць спакусу ўладарыць і прыняць на сябе адказнасьць там, дзе значна лацьвей узваліць яе на каго папала й хто пад руку патрапіць? Такіх вякі ўзгадоўваюць, эпохі. У нас жа столькі моцы яшчэ не назьбірана, не назапашана. Мы ўсе пакуль — у навучальні. У школцы зямнога Быцьця — «установе» жорсткай, бязьлітаснай і бескампраміснай. Тут не адкупісься, не падладуесься, не прыгнесься й ня выпластаесься травой. У гэтай гартавальні кожны з нас — на поўны рост: якім ёсьць і якім быць можа.

Акурат жа дзейнасьць дакладнай формулы «ёсьць і быць можа» й вылушчвае з нас нашу сапраўднасьць ды выводзіць на сьвет цэлы — паказаць. Прычым сапраўднасьць тая пачасту нават і блізка не знаёмая нам самім. Ну, да прыкладу, *«ці знаў хто блізка з вас Тараса»* — нашых экскандыдатаў на прэзыдэнта й нашых грамадзян, што ўзялі ды й выплеснуліся на Плошчу гэткай

грамадой, якой панічна спалохалася ўзброеная, а з таго ж і неадольная дзяржава? Ня складзены быў яшчэ арганізм плошчавы, ня меў роўнага пульсу й дыханьня, не валодаў нават інфармацыяй, ШТО заплянавана й што можа быць потым. Затое памкненьне да Волі яднала ўсіх (за выключэньнем дзяржаватрымцаў) у нешта АДНО, не сфармаванае, не азначанае, не ўзмужнелае й памудрэлае, мала падуладнае нават найпразорцу, ды АДНО. **І гэта — наша перамога**. Над самімі сабой, уцягнутымі ў доўгую й глумлівую свару ўлады з апазыцыяй і цкаваньня на яе народу.

Не, я не кажу, што на Плошчу раптам шыхтова выйшаў народ. Але й на «кучку адшчапенцаў» гэта ўжо далёка не выдавала. І не за лідэра ці заклікалу людзі чапляліся, як невідушчыя, — яны ступалі на Плошчу, а затым рабілі пераход да ўрадавых будынкаў зь ВЕРАй (сьмяхотна гэта прызнаць...) у тую самую хвалёную дзяржаўнасьць, якая, нібыта, стаіць на варце агульнаграмадзкіх інтарэсаў, якая ёсьць прагрэсам адносна продкавых абшчын і роду. Яны спадзяваліся (ці не астатні раз?) на разважнасьць і раўнаважнасьць тых, каму вырашальнай бальшынёй даВЕРАна ад іх імя гаварыць у Цяперасьць і Будучынь. Ціха, ледзь прыкметна, ды ўсё ж трымцела надзея — калі не на дыялёг зь дзяржавай, целам якой яны й ёсьць, дык на маналёг зь ёй, хаця б знакамі, жэстамі, як толькі й умее выказацца цела, тым самым засланяючы Дух ад зруйнаваньня...

Аж ня тут тое было! Аскал дзяржаўнай пашчы ў гатовасьці панішчыць кожнага нязгоднага са збуцьвелай дарэшты стабільнасьцю быў такім драпежным і такім лютым, што й насамрэч выяўляў нашу натуру ажно зь няпомных прадоньняў, дзе схаваны й дрэмлюць сабе інстынкты сама... (захаваньня? выжываньня? узнаўленьня?). Ці самапахаваньня? Спамінаньня былога ў былым, укручваньня ў бессэнсоўны вір няспыннай барацьбы?..

## «Ня трэшчына ў часе — разлом»

А ўсяго патрошку сыпанулася ў гэты плошчавы жар нястрымнасьці. І выйшла такая пякотная, такая спальвальная выбуховая сумесь, калі пагрозьліва дыхнуў на дзяржаўную плошчу зьмярцьвела-халодны, скурчаны, зацяты й няўтольна скрыўджаны Цмок — у зьнямозе хоць што-небудзь, хоць на кроплю зрабіць набліжана да нейкай там цывілізаванасьці ды паважнай дзяржаўнасьці. Жывёльны страх, ён жа выяўляе не геройства й не высакароднасьць — ён ператварае адных у злачынцаў, іншых — у адступнікаў, астатніх жа (іх заўсёды найменей) узводзіць на прыступку ахвярнага служэньня.



Фота Сяргея Балая



Зусім, дарэчы, не стасуюцца да гэтай ахвярнасьці й служэньня патэтычныя прыдомкі «Айчыне», «краіне», «зямлі», «народу». А тым больш — ідэі, што як ні пакруці, дык паўстае голай і бездапаможнай на супраціў звычайнай чалавечай годнасьці. І рыхтык гэтая танюткая межавая лінія пад назьвіскам «годнасьць» падзяліла Беларусь на шматкі, раскроіла, раскрышыла й кінула ў сіроцкае адчуваньне нікомунепатрэбнасьці. Адны, баронячы мажлівасьць застацца (а як заСТАцца на волі, але ў няволі — ад няўцямнага баязьліўца-гаспадара й ад самога сябе?), каюцца й чакаюць спачуваньняў, іншыя, выбіраючы паўСТАньне Духу, аберуч трымаюцца за прынцып: «*Як ты адзін, ты — больш за аднаго*», — і абрыньваюцца ў гіпэртанічную крызу, як у ахалоджвальную студню, трэція ўсё яшчэ спрабуюць на гэтым хісткім падмурку СТАцца, ды спаўзаюць да дзіркастай, як рэшата, маны.

На ўздыбленых хвалях беларускага разлому, які цяпер можна лоўка скарыстоўваць дзяржаве ў змаганьні «за меншасьць», што — бачыце! — адважылася адшчапіцца ад, быццам бы, скансалідаванай вакол добрай і клапатлівай улады большасьці, запяклася нявінна пралітая кроў. Нявінная ўжо таму, што гэта кроў людзей, выйшлых на ўладны пляц, да свайго кіраўніцтва, не з дубінкамі й шчытамі, а ўсяго толькі з адкрытымі сэрцамі й сьцягамі этнічных колераў, якія, вядома ж, не маглі засланіць ад нападу, але ўжо самой прыналежнасьцю да векавой традыцыі й сьвятых Дзядоў надавалі магуты пачуцца разумнай часткай нейкае супольнасьці, схаванай, закамуфляванай пад задаволеную чарка-шкваркавую большасьць.

Вядома ж, не ад імя гэтае мітычна-расплывістае большасьці рызыкнулі аспрэчыць вынікі выбараў колькі дзясяткаў тысяч «ворагаў народу», а толькі ад імя свайго сумленьня. Ды яшчэ, мабыць, агучваючы маўчаньне жывое зямлі, якой ужо няўцерп, напэўна, трываць гэты боль пашырэньня трэшчыны ў разлом, калі людзтва пачынае асьцерагацца ўзаемных стасункаў у мэтро, у аптэцы, краме ці паліклініцы: «А раптам — ня свой, і накінецца, і аблае».

Дык што ўзрасьце потым, калі ня будзе нас, бунтароў, і сыйдзе нарэшце ў нябыт глупотны й карысьлівы рэжым, пакінуўшы нашчадкам напамін-разлом, на равох беларускага падзелу? Хмызьнякі забыцьця альбо валошкі ў калосьсі новага мысьленьня й новага згуртаваньня? І з чаго яна мае сілкавацца, наша прышласьць, далёкая й заўтрашняя? Што страцілі й што здабылі мы ўсе разам («някемная меншасьць» у зьвязку з народам-большасьцю) на тым падвіслым над прорваю пагібелі мосьце, на які адны ўздымаліся поклічна самі, а іншыя паслухмяна-радасна выконвалі загад біць і трушчыць — каб не «растерзали страну»? І зь якой ношкай рушыць далей кожны паасобку — адны, усьведамляючы сябе вартай дзяржаўнага спакою, іншыя — носьбітамі энэргіі вызваленьня й спадкаемнага гонару? Якое выйсьце вышукаць з сумневаў, узаемных папрокаў і непаразуменьняў, каб не спакусіцца, ня даць сябе справакаваць на расправу адно з адным перад няўмольна насоўвальным разломам?

## «Мы сябе ўспамінаем самі»

Мы сябе дакараем і ганім, мы пудліва азіраемся па бакох, шукаючы яшчэ й яшчэ аднаго адступніка, вінавацячы ўсіх запар — эксандыдатаў, цяперашніх і былых, быдлячую нацыю, пустэльню, зь якое не зьяўляецца чамусь сапраўдны лідэр. Мы захліпаемся сьлязьмі й абурэньнем, але... Але пакуль ня бачым, не адчуваем самага важкага — нас, тых, якімі былі да Плошчы-2010, больш няма. Нам дадзена адно спамінаць сябе колішніх. Бо адгэтуль, ад моманту разбойнага нападу на грамаду, сабраную не абыдзе, не па-бандыцку ўтоена, але на ўрадавым пляцы, зусім па-дзяржаўнаму, адпаведна з канонамі ўладазладаваньня, каб голас падаць — да асоб з надзвычайнымі правамі, ды не прыкметнымі абавязкамі, — мы займелі статус перасьледаваных. Ганаровы ці прыніжальны гэткі стан рэчаў — як хто ў сабе сканструюе. Істотна, прынамсі, тое, што ад 19 сьнежня нават тыя, хто патрапіў пад карны меч выпадкова, каго злавілі ў дарозе, прымыкаюць да асобнай касты грамадзтва — да **касты адданцаў Беларусі**. І дзіва-дзіўнае: на гэтай зямлі нязмоўклых старажытных містэрый ня кожны з удзельнікаў нашага раптоўнага ахвярапрынашэньня нават і здагадваецца, якую ролю адвяла яму Плошча й які чын ён спаўняў, заяўляючы «антыдзяржаўным» лёзунгам «Жыве Беларусь!» пад ляскатаньне шчытоў і пахлест дубінак асабовае права на ўдзел у стварэньні й падсілкаваньні сваёй, да крывінкі блізкай і падатлівай на лагоду й цеплыню, Радзімы.

Зрэшты, як і належыць, згодна з абрадавымі ўстоямі, самую сутнасьць адбыванага ведаюць і разумеюць толькі пасьвечаныя. Жаль толькі, што якраз пасьвечаных мы й ня маем аніякай мажлівасьці пачуць. Менавіта ж з гэтай прычыны **каста адданцаў Беларусі** перабывае пакуль у разгубе й адчаі, нязважна на той факт, што бальшыня, падаецца, выбрала явіцца на Плошчу ня сьледам за каторым з прэтэндэнтаў ачоліць (эўрапеізаваную!) краіну, а быццам насуперак усім непрадказальным акалічнасьцям, зьнячэўку аж для сябе саміх, у якасьці Вояў Сьвятла, на нейкае містычнае, мітычнае месца грамадзянскай моцы. І Плошча, дарэчы, не адсланіла даверлівых дзяцей сваіх, што ступакамі паўрасталі ў крэўны дол, не прадала. Пакорліва прыняла ахвярніцкую

ролю. Аберагчы вось толькі не адолела, захінуць ад вастрыя ўладніцкай нянавісьці.

Хаця... насамрэч з самай таемнай сярэдзіны нашай драмы высьвечвае, хай сабе й кволая, безабаронная, крохкая, але радасьць — непадменная радасьць паяднаньня думцаў, адораных надзвычайным на сёньня талентам воляцьверджаньня супраць гвалту й разбуральніцтва. **І гэта — наша перамога**. Бо ўсе, хто патрапіў у вязьніцы, шпіталі альбо на свае вочы ўбачыў і жахнуўся, як учынялі цынічна сплянаваны разбой рабачаі дзяржавы з рамантыкамі, памкнёнымі адужаць невылечную хваробу ўладніцтва людзкімі просьбамі-грозьбамі й воклічамі пра жывую Беларусь, усе ПЕРАМЯНІЛІСЯ, пераўтварыліся ў інакшых, чым спамінаюцца сабе самі.

## «Недасягальнасьць перамог — усё, што ў гэтым лёсе ёсьць»...

Паэт Някляеў, здаецца, і цяпер, пазбаўлены ня толькі волі, але й натуральнай у больш-менш ачалавечанай дзяржаве мэдычнай падмогі, харобра прызнае (сам дзеля сябе перадусім) недасягальнасьць перамог. Адно мудрыя й відушчыя ведаюць усяленскі закон, адпаведна зь якім кожная перамога насамрэч зьдзяйсьняецца толькі на мэнтальным узроўні, а на пляне фізычным яна — усяго крок наперад, які прадугледжвае хаду далей. Бо іначай — зьмярцьвеласьць, хоць бы й называлі яе спакоем і стабільнасьцю. «Gloria victis!» — выснавалі старажытныя, б'ючыся ў тым самым сіле залежнасьцяў, якое спрабуем разарваць мы. Слава пераможаным! Таму што яны ня ведаюць супыну на абраным кірунку. Таму што перад імі, як маяк, мэта, якая чакае сягненьня й перамяненьня. Таму што толькі пераможанаму й дадзена насамрэч зьведаць кошт і смак перамогі, якой ніколі ня стацца спаўна, дарэшты. Якая ёсьць толькі чуваньнем, але не ўматэрыялізаванай рэаліяй.

Дык вось менавіта ў форме ЧУВАНЬНЯ ў нашым Краі, на нашай зямлі, у нашых сэрцах сёньня прытулілася **наша перамога** — перамога тых, хто не пабаяўся выявіць сваю пазыцыю, ня сёк дубінкамі галовы іншадумцаў і ня вёў анікога на ўзарваньне дзяржаўных устояў, але патрабаваў толькі адказу за сфальшаваныя не ўпершыню свае галасы. Перамога тых, хто прымае пакуты, нікога не параніўшы й не абрынуўшы ў бруд і мярзотнасьць. Перамога тых, хто ня мае й каліва свабоды сказаць сваю праўду краіне, абылганай і зацягнутай у такую багну страхотак, што здароваму сэнсу няма ўжо й як зварухнуцца. Перамога тых, хто гатовы й зь пякельнай паразы выйсьці да людзей з чыстым, ня схрыплым з боязі галасам. І гэтая, ня яўная, але таемная, тонкая, як прадзіва долі, перамога — перамога касьмічнага, усяленскага роўню. Ужо цяпер, у варунках замкнёнасьці й прыніжэньня, гэтая перамога падмацавана магутнай энэргіяй продкаў і наскрозь прасьвечана тым самым Сонцам, на якое калісь глядзеў Максім-кніжнік, разгортваючы голымі цёплымі рукамі «цемень вечнай ночы».

Але вечнай ночы не бывае, як не бывае й адзінай і назаўжды ўсталяванай перамогі. З ночы можна скаціцца ў хіжую бездань, а можна аднавіцца ў Сьвятло, перад якім самі сыходзяць у нішто, у пыл, у спрах пачвары, нацэленыя на загубу. Так апавядаюць чарадзейныя казкі, раскрываючы перад кожным, адораным любоўю ЖЫЦЬ, адпачатны код сьветаладу. І самае дзіўнае, што з болю й адчаю шчадротна праменіць сьвятло — неадольная сіла Любові. З такога болю й з такога адчаю, калі балюча аднаму за ўсіх, а ўсім — за кожнага. І гэта — **наша перамога**. І ўжо толькі дзеля гэтага «*варта было нарадзіцца*». Гэтаксама, як і варта памерці.

Толькі памерці не за нешта й ня супраць нечага. Адкідаючы ідэалягемы, як зношаную апранку, кожны, хто адважыўся выйсьці на выбарчую кампанію, а затым на Плошчу альтэрнатыўна адзінаўхвальнаму (акрамя «прафэсійных» кандыдатаў, зразумела), мусіў быць гатовы папросту зьнікнуць, памерці — не гераічна, ня слаўна, а зусім па-жывёльнаму: быў і ня стала. Такое ж напрактыкавана ў нашым правільным каралеўстве. І ўжо само прыйманьне падобнага да гэткага зыходу ёсьць праявай нашай моцы. Супольнай моцы тых, хто процістаўляе дыктатуры ня прагнасьць да ўлады (хоць менавіта гэткая мэтаскіраванасьць і ёсьць адзіным рухачом разьвіцьця ў варунках дзяржавы), а толькі сьцяг — сябе саміх, як сьцяг. Бо трэба ж зусім ня мець розуму, каб насамрэч паверыць у мала-мальскую, аднаадсоткавую нават, мажлівасьць дабрацца да рэальнага трону там, дзе да трону прыцьвікавана намёртва спалатнелая істота, што ўяўляе зь сябе суцэльны чорны жах перад немінучай адплатай за ўсё натворанае й замысьленае.

Менавіта гэткі стан адмаўленьня ад свайго фізычнага «я», падуладнага таксама і страху, і болю, і жалю, і пераўвасабленьня ў «жывы сьцяг», занатоўвае задоўга да зьбіцьця й арышту ў хадзе да Плошчы Ўладзімер Някляеў:

*Помні ўсіх і нікога ня помні,*
*ідучы ў нікуды.*
*Толькі ты, што праходзіш па полі,*
*засяваеш сьляды.*

І вось поле, па якім ішлі разнасьцежаныя «сьцягі», пазначана сьлядамі — крывавымі. Цяпер колькі ні складай і ні камэнтуй ілжэкнязь Вітаўт-Генадзь Давыдзька (ня так ужо ж і даўно гэты паўнамоцны «праўдзівец» выдаваў сябе на Купалаўскай сцэне якраз найбеларускім і найхаробрым з нашых валадароў) «Железом по стеклу»,

сьляды ўжо засеяны й адбіты ў крэўнай глебе. Сьляды крыві — дакладнай інфармацыі пра ўсё, што здарылася ў віхурны вечар на Плошчы, да якой некаторым «сьцягам» не далі нават і дайсьці.

Маўчаць помна й сьляды на Нямізе, дзе так гістарычна, так знакава, аж ад часоў Усяслава Чарадзея й да дзён нашых, снапамі падалі ахвяры. І ўзыйдуць з тых сьлядоў парасткі. Бо гэта **наша перамога**. Перамога ўскладаньня ахвяр, каб не сыйсьці з Дарогі, не папаўзьці чалабітна й не запрадаць зь перапуду саму чалавечую сутнасьць, падораную Богам адпачатку. Каб дараваць потым зламаным у пагрозах і нацкоўваньнях, саслаблым у прэлюдыях катаваньняў. Каб коштам страты дзяржаўных падаванак — паўплатнай працы, навучаньня альбо й самога прытулку-дому — зьвесьці людзей, здатных мысьліць, спачуваць і шукаць Волі, адно з адным у касту найвышшага кшталту. Каб убачыла й пачула існая Беларусь, наўпрост зьвязаная з прадаўнім Родам, што мы адшліфавалі ў змроку рэжыму і ўзьнялі ў сьвет усе разам дыямэнт **грамадзянскага сумленьня**, якое дыктуе цяпер і зьвяршае найгуманныя прынцыпы людзкіх дачыненьняў — узаемадапамогі, павагі й злучнасьці ў часы нягод. Мы зьляпілі тое **грамадзянскае сумленьне**, якое аніяк ня выявіла сябе нават з-пад Чарнобыльскіх крыжоў. Мы падрасьлі як нацыя. Дакладней — як розум нацыі.

А ў чорных воранаў з дубінкамі й шчытамі, што быццам бароняць дзяржаву, вынішчаючы папраўдзе й здогад пра яе (бо дзяржава ж нікчэмная дашчэнту, калі з усім сваім арсэналам сродкаў для выжываньня хапаецца роспачна толькі за меч, дзяржава — бясьсільная), ані сьлядоў, ні твараў, ні імёнаў. Адно карыта, да якога пажадных шмат і над якім гнуцца даводзіцца ў крук.

І выйшла так, што ні авалоданьне хай сабе і ўсім багацьцем Зямлі, усёй зброяй і ўсімі мэтадамі ўплыву на чалавечую псыхіку, ні віртуознае ўмельства масава адурманьваць і задавальняцца дэградатыўнай падтрымкай і блізка не стаялі да тае існае перамогі пераможаных, абуджанай і акрыленай, якая аднойчы зьмяце з гісторыі й дым звар'яцелай тыраніі, пакінуўшы хіба нашчадкам перасьцярогу, сфармуляваную паводле Божага запавету Празорцам-Караткевічам: «Не давайце сьвятыні псам!»

## «Як прывіды, як сны пра сны, як здані...»

А пакуль мы спрабуем вырваць сьвятыні з псовых лап, пакуль пад сіверны вецер Паўночных могілак вялізнай грамадой разьвітваемся з паэткай і журналісткай Тацянай Сапач, загінулай зьнянацку, але адной з нашых ахвяр, прывіды тае большасьці, якой так злоўчана засланяецца ад сьвятла дыктатура, жывуць сабе й ведаць ня ведаюць, што й дзе якое чыніцца. А калі чаго й чулі, дык пра бандытаў, што сілком парываліся захапіць Дом ураду.

Такая вось беларуская рэчаіснасьць: індыфэрэнтныя шчыльна пазачынялі форткі, як вечкі трунаў, каб і подыху ня чуць нейкіх змаганьняў і перамен, застабільныя ўсплёскваюць рукамі ў шчырым зьдзіве: «А чаго ж вам трэба? Жывыя — і добра», схільныя да аналітычных разваг таксама няўцямна разводзяць рукамі: «Не было ў ніводнага з кандыдатаў разумнай праграмы. Няма кім замяніць неўміручага кормчага», зласьлівыя ўтрыманцы вохкаюць: «Каб жа якога нам лідэра! А то ж адна драбната лезе»...

І на гэтым тле звыклых нараканьняў ды нічоганераблення тыя, хто выйшаў на Плошчу, і тыя, хто з Плошчай паяднаны адным напятым нэрвам, ёсьць сапраўды пераможцамі. Бо ва ўмовах, калі правечна беларуская хованка: «Абы ціха, абы вайны не было!» — пераніцавалася ва ўдзячліва-рабскае паклоньніцтва: «Жывыя — і добра», — калі адна частка грамадзтва патрабуе нейкіх ратавальных праграм, ня кемячы, што аніякая праграма не акажацца дзейснай у разруху пад назовам «стабільнасьць», а іншая вычэквае, мабыць, заежджага супэрмэна, які на талерачцы з акаёмачкай прынясе ўсялякіх даброт, каб мы елі ды трыбухі пагладжвалі, узьняць голаў да Сонца й выйсьці ў сьцюжу бараніць нешта эфірнае, няўлоўнае, недатклівае — гэта перамога. Над нязбыўнай нашай талерантнасьцю, якая почасту абарочваецца ў насалоднае паяданьне бліжняга, гордая й высокая перамога.

Таму што клетухнаў розных панастаўляна было ў тыя дні паўсюль, па ўсёй прасторы незьлічона. Каб мы ў іх патраплялі й зблытваліся. Мала хто, відаць, задумляўся, чаму так падганяліся выбары пад канец году, на зіму й напярэдадні тэрміну. А рэжым улічыў і разьлічыў усё да кропелькі. 19 сьнежня прыпадала роўна на 15-ы месяцовы дзень, адзначаны ўжо даўно, сьледам за народнымі назіраньнямі, яшчэ й навуковымі досьледамі як асабліва небясьпечны ўспыхваньнем агрэсій, канфліктнасьці, цёмных настрояў і злачынных намераў. Нашы продкі называлі гэты дзень сатанінскім, д'яблавым. Справакаваць якую свару-калатнечу на поўні 15-га дня — як на вагонь дзьмухнуць пад моцны вецер.

А тут яшчэ месяцовае зацьменьне бліжэла, што відно было на Зямлі 21–22 сьнежня. Чалавека зацягвала палонка ірацыяналізму, дэпрэсіўнасьці, паныласьці. Бо мы залежныя ад зрухаў на Месяцы, і гэтай неўтаймавальнай сілы ўплыву начнога сьвяціла на плянэту адужаць немагчыма. Затое можна скарыстаць. Валодаючы патайнымі ведамі. Можна закласьці праграму разьвіцьця падзей на паўтара дзясятка гадоў наперад.

І нас усіх, імаверна, вялі да стану «*як прывіды, як сны пра сны, як здані*», каб распараджацца й надалей, быццам падатлівым матэрыялам. Прынамсі, калі ня ўсіх прымхліва бачылі бяздумнымі зданямі, то пакорлівую глухую бальшыню — без сумневу. Ну, астатніх меркавалася лёгка ўвесьці ў зман і справакаваць (скарыстаўшы псыхалягічную няўстойлівасьць таго дня) на разьбіральніцтвы, давёўшы іх да піку выбуховасьці. І тады... Гладкая дарожка каралю ў царства неперапыннага валадарства выслана й ружамі ўквечана.

Ды мы не паддаліся! Мы не ўцягнуліся ў правакаваныя ахоўнікамі ладу-ўлады кучымалы. Вось чаму зьлютавалі й дагэтуль няўкормна лютуюць тронныя й прытронныя паяцы. Вось за што адпомшчваюць і катуюць, змушаюць да падманных прызнаньняў і не дапускаюць да нявольнікаў адвакатаў, вось за што дэманструюць зьнікненьні й раптоўныя абвешчаньні экс-кандыдатаў на прэзыдэнта. Бо 19 сьнежня невідочна, але Адчувальна, ня сілай, але Любоўю, ня злосьцю, але Сьвятлом, не руйнаваньнем, але Зьяднаньнем сталася й змацавалася, засеялася ў сьнег крывёю і ў сэрцы спагадай адно да другога **наша перамога**.

Ужо цяпер, аднойчы, як насьпее час, мы выйдзем не з адзіным жаданьнем — пазбавіцца ад манапольна прысвоенага права на нашы думкі, учынкі і нават жыцьці. Цяпер мы дакладна сфармулюем і абвесьцім, чаго хочам дасягнуць. Бо цямнотная сіла саслабне ў сутаргах уласнага страху, і пасьвятлее ў нашых сэрцах, засьвятлее пэрспэктыва Быць, а не здавацца. Цяпер мы скінем нарэшце ганебнае памкненьне «людзьмі звацца», што валачэм на плячох ня першы век, і ўзьнясём сваю, годную, праграму заможнага і ўпэўненага гаспадараньня на сваёй зямлі — са сваёй мовай, сваімі звычаямі, сваім ствральным талентам жыць вольна спаміж папярэднікаў і нашчадкаў.

А паэт Някляеў, змучаны, зранены, кінуты ў цямніцу ды няскораны, зноў зьнекуль здалёк, з тае пары, калі яшчэ прадчувалася нязбытае, ужо цяпер, сёньня, мужна ўзнадзейвае: **«Здабыў я ўрэшце волю на зямлі»**. Уведаўшы на Плошчы дарэшты — праз боль, адчай і нязломнасьць, — што Воля зьвівае гняздо спачатку ў душы, а затым узьлятае да Вышы, мы ўсе разам, з усяе моцы й з усёй нерастрачанай верай абераджэм **нашу перамогу**. І злыдні, пагрузлыя па вушы ў мане, адступяцца, адыдуцца, счэзнуць, палопаюць, як порхаўкі, пад цяплом нашай зьяднанасьці, пад сьвятлом **нашай Перамогі**.

# Маленькое «но...»

**Это сейчас кажется, что исчезает все. На самом деле рождается то, что еще неизвестно никому из нас.**



*Эдуард МЕЛЬНИКОВ*

Ощущение некоей новой черты, которую переступила власть, явилось общим настроением после 19 декабря. Черты, после которой нет и не может быть возврата к прежнему, хотя и оно, это прежнее, было далеко от здравого смысла.

В течение предыдущего года власть не очень изобретательно демонстрировала показную склонность к либерализации отношений с прессой. Это было вызвано общей обстановкой, предшествовавшей избирательной кампании.

Заметным шагом стал допуск двух газет в киоски розничной продажи в весьма ограниченных количествах. Видимо, кто-то посчитал, что это не опасно: ведь существует многосоттысячная «Совбелка» и иже с ней. Для тех же, кто в Европе спал и видел, что г-н Л. «соскользнет в демократию», этот факт стал просто знаменем.

Нужный власти баланс между изданиями «чэснымі» и «нячэснымі» обеспечивался, с одной стороны, наличием фиговых листков законности, а с другой, прочным рефлексом в правовом сознании большинства независимых журналистов. Ведь в Беларуси до сих пор де-факто существовала подцензурная журналистика. Точнее, самоцензурная. Большинство издателей, наученных горьким опытом коллег и своим собственным (экономическая дискриминация, вынесение предупреждений, приостановление выпуска изданий, немотивированные закрытия, изъятие техники, да и просто избиение репортеров и пр., и пр.), уже который год вынуждены работать с оглядкой, которая со временем стала привычной.

В телевизионном вещании (а это поистине «термоядерное оружие», по выражению главного ньюсмейкера) накануне выборов происходило что-то дивное: программа «Выбор» с новым ведущим Сергеем Дорофеевым сразу привлекла к себе внимание. Но очень скоро стало ясно: главной задачей программы было выпускание пара в ситуациях, когда замалчивать что-либо совсем брутальное не было никакой возможности. Смело формулируя проблему, ведущий всякий

раз спотыкался и, словно перед невидимой стеной, останавливался перед выводами, которые напрашивались сами собой. Они, эти выводы, требовали обобщений. А вот здесь уже работали прочные «табу», переступать через которые никому не было позволено.

Впрочем, даже в таком виде передача порождала иллюзию: власть говорит с нами, она озабочена нашими проблемами. Однако на соседней кнопке той же государственной тележурналистики регулярно шли в эфир разгромные, спецслужбами разработанные «разоблачения» всего, что оппонирует властной пропаганде. Ведущие этих программ прикидываться совестливыми и не пытались. Провокации и подтасовки фактов, прямые фальсификации и оскорбления стали фирменным стилем Первого, главного канала.

Сергей Дорофеев и Юрий Прокопов — это одно лицо, только в разных ракурсах освещенное. Это «добрый» следователь и следователь «злой».

Таким образом, баланс сохранялся и здесь, ситуация оставалась под контролем.

Сейчас необходимость в таких инсценировках отпала. «Добрых» следователей удаляют, они свое дело сделали.

Сегодня уже нет необходимости порождать иллюзию либерализации. Хватит, наигрались. Маски сброшены.

И даже легче становится: меньше лжи и лицемерия, все проясняется.

Масштаб послевыборных репрессий показывает, что де-факто существование непокорного общества, не согласного умножать молчанием ложь, властью не только признается, но и вызывает животный страх и отчаяние.

Дело в том, что власть всегда отказывала обществу в праве решать важные социальные вопросы. Более того, власть рассматривала самоё себя не как часть общества, а, напротив, общество видела (и видит) исключительно как объект своего — властного — воздействия. Сейчас власть ставит вопрос ребром: или-или. Или общество становится немым, безгласным и послушным, или несогласных ждет полный разгром.

Ширящиеся аресты и обыски ясно показывают, что останавливаться власть не собирается, волна репрессивных действий только набирает силу. Уже после 20.00 там, на Площади, задерживая и избивая кандидатов в президенты (статус которых тогда еще действовал!), власть показала, что не будет учитывать такие благоглупости, как право, справедливость или простое человеческое сострадание.

Так возник первый круг этой спирали Бруно. По старым — до 19 декабря — меркам, узники «Площади» могли рассчитывать на обычные в



Фото Сергея Балая

*Репортеры в центре событий: экс-кандидат Виталий Рымашевский только что испытал дубинки спецназа*



*Родственники ищут своих в списках центра изоляции правонарушителей на улице Окрестина*

таких случаях институты защиты: адвокатов, правозащитников, прессу, общественное мнение. Нынче любых защитников власть выставляет «пособниками экстремистов». Натягивается вторая спираль «колючки». Одним из объектов подавления становятся независимые СМИ.

Последние действия Министерства юстиции в отношении Белорусской ассоциации журналистов не оставляют в этом никаких сомнений. Хотя ситуация логична: в наших условиях профессиональная журналистская организация не могла не стать правозащитной в сфере свободы слова и СМИ. Используя пятачки декларативной законности, сохранившиеся на страницах трижды перекроенной Конституции, БАЖ сумела выстроить довольно устойчивую систему правовой защиты редакций и журналистов, имеет возможность оперативно донести до мировой общественности факты давления на прессу.

Власть стремится «дверцу» захлопнуть.

Изолированных узников не услышат. Лишенные лицензий адвокаты немногим смогут помочь. Правозащитные центры и комитеты, подвергшиеся обыскам и задержаниям сотрудников, существенно ограничены в своих возможностях. Остается только воткнуть кляп тем, кто еще способен рассказать обо всем этом и вынести «сор» из нашей, пропахшей полицейской будкой, избы. Вот тогда все будет в порядке — тишь да благодать. «Все спокойненько, все пристойненько, от общественности вдалеке».

Провокация с крушением дверей в Доме правительства, массовое избиение мирных людей на площади, «добор» непричастных до запланированного количества задержанных, все последующие действия по запугиванию, постановке «на учет» и под контроль оппонентов — все это звенья одной и той же цепи, планомерной и последовательной кампании установления абсолютного господства единоличной власти.

Но…

В теории и практике социального управления есть постулат: все сложные проблемы имеют простые, понятные для всех… неправильные решения. Если кто-то «наверху» думает, что доступные его пониманию репрессивные меры приведут к желаемому результату, то он жестоко ошибается. Все, порожденное насилием, раскачивает некий невидимый маятник, который неизбежно двинется в другую сторону. Неизвестно как, но обязательно — противоположно тому, куда качнули от оси, от здравого смысла и нравственных принципов. Не случайно маятник всегда был символом времени, которое не останавливается никогда.

Как это ни парадоксально, но существование лоскутков независимой журналистики и у власти, и у ее оппонентов сохраняло чувство берега, отрываться от которого не хотел никто. Оно и сейчас сохраняется, это ощущение. Отвечая на вопросы о будущем белорусской независимой журналистики, многие из моих коллег, которых я глубоко уважаю, выражают робкую надежду, что в нашем-то веке, в наши дни, ну не может же быть так, чтоб совсем уж…

Оставьте иллюзии, и поскорее. XXI век придет к нам в ином обличье.

Наша ситуация, скорее всего, разрешится следующим образом: чем более широкой и тотальной будет зачистка медиапространства, тем больше предпосылок возникнет для создания и развития совсем иной белорусской журналистки. Власть собственными руками формирует

объективную нужду в появлении таких информационных источников, до которых она уже не дотянется. Власть сама создает себе альтернативу. Не было счастья, так несчастье поможет. Так уже бывало в истории, и не раз.

Администрация может запросить подтверждение в Институте журналистики. Работающие там историки на тысячах примеров покажут, как революционные партии (и большевики в том числе) при помощи подпольной, неподцензурной печати сумели расшатать и обрушить систему государственной власти, куда более прочную, чем нынешняя. «Поправка на время» для нынешней власти неутешительна: сейчас нет необходимости создавать неподцензурную массовую коммуникацию исключительно в партийных структурах. Существует масса иных возможностей. И множатся примеры того, как медиаресурсы становятся средством сплочения людей и выдвижения общественных и политических инициатив. Пример сайта «Хартия'97» — перед глазами. Современные информационные технологии позволяют напрямую мобилизовать людей на активные политические действия.

Кажется, сейчас наступает такой момент, когда журналистское сообщество обязано доказать, дееспособно оно или нет. Переступив правовой (пусть зачастую и символический) Рубикон, власть, сама того не понимая, создает площадку для боев без правил, а это уже совсем иная ситуация. Демонстрируя правовой нигилизм, власть тем самым освобождает от иллюзий людей, которым уже нечего терять.


Фото Сергея Балая

*Репортеры встречают отбывших административный арест*

Есть только одна проблема: наличие этического принципа, хорошо известного всем профессиональным журналистам. Даже в этой ситуации мы не можем становиться пропагандистами, пусть даже и «с обратным знаком». К сожалению, в последние годы белорусская независимая журналистика, лишенная доступа к информации, придавленная административным и экономическим прессингом, вынуждена была превратиться из журналистики фактов в журналистику мнений. Проправительственные издания и каналы, вместо того чтобы обнародовать ясные и однозначные факты (чего они, по понятным причинам, делать никак не могли), топили сознание своего читателя и зрителя в многочисленных комментариях и инсинуациях.

Но и их антипод, журналистика негосударственная, так же вынуждена была пользоваться туманными разглагольствованиями записных экспертов, невнятными комментариями и прогнозами, где желаемое выдавалось за действительное, а действительные факты (неизвестные никому) подменялись субъективными мнениями, ангажированность которых не вызывала сомнений.

Новые условия не могут не привести к возникновению новых форм и методов деятельности независимой белорусской журналистики.

Это сейчас кажется, что исчезает все. На самом деле рождается то, что еще неизвестно никому из нас.


Фото Сергея Балая

# 19/12/2010




МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МІЛІЦЫЯ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ

# Чаму Дзед Мароз спазніўся ў 2011-м?

*Марыя НОВІКАВА*

Па белай-белай прасціне
Заснежанага поля
Мароз кіруе да мяне —
Чырвоны, як ніколі.

Я да яго: — Дзядуля, што?
Чаму увесь ты ў «мыле»?
— Ды нейкія за паліто
На вуліцы злавілі.

З плячэй маіх садралі мех
І барадой мяне — у снег.
Крычаць, што там, пад барадой,
Хаваю твар зусім не той,
Нібыта быў на Плошчы
Дваццатага, уночы...

Згаджаюся: «На плошчы быў...
Але ж вакон зусім не біў.
Хіба намаляваў прыкол
На шыбе заінелай...»
А мне: — Падпісвай пратакол!
Ррраз! І прышылі «дзела»!

* * *

Мігценне елкавых гірлянд
Пад галасы артыстаў модных...
А снег, не ўпаўшы на зямлю,
Зрабіўся ўжо мінулагоднім.

Ён засыпае гарады:
Высоткі хмурыя і плошчы —
На чалавечыя сляды
Стамлёны Бог глядзець не хоча.

На плошчу Нашых Вольных Сноў,
Пад ногі ідалаў і елак
Жывая праліласа кроў —
Чырвоная на снезе белым.

І ў тэлевізары ізноў
Мана, як снегавей, густая.
Але з-пад сажы чорных слоў
Жывая чырвань прарастае.

І на зямлі ўжо новы год.
І новы дзень расплюшчыць вочы.
О Божа! Блаславі народ
На бел-чырвона-белай Плошчы!

**Марыя Новікава** закончыла музычную вучэльню ў Наваполацку, затым — сталічны педуніверсітэт імя Максіма Танка, цяпер працуе ў школе мястэчка Самахвалавічы, што пад Менскам. Адначасова ўжо тры гады яна — арганістка вядомага на ўсю краіну касцёла Святых Сымона і Алены. Пераможца конкурсу бардаўскай песні Радыё Свабода.




*Константин ЧЕРНЕЦ,*
*www.czerniec.livejournal.com*



Забралась муха в будильник. Стрелки: тик-так; зубчатые колесики: тук-тук. Зазвенел будильник, и отбарабанил молоточек по любознательной мушиной голове. Мы с супругой моей люди не героические. Это нас государственная машинка просто своим колесиком подцепила. И поволокла — с зубца на зубец.

Омоновцев не зря «космонавтами» зовут. Они и в самом деле действуют, как пришельцы в черном: хвать попавшийся экземпляр человеческого рода — и в автобус свой пришельческий. С матом, с криками, с тычками в спину: «Морды в пол! Смотреть вниз! В окна не смотреть!!! Пригнуться!» Это тоже их одежда для души, черная и глянцевая, чтобы ничто человеческое им душу не оцарапало.

Но в окна мы все же поглядывали украдкой. По ночной улице ходили обычные люди. Которым не хватило места в автозаке. Интересно, видел ли кто-нибудь из них, что делалось, слышал ли, как отчаянно кричала моя жена, когда меня выбросили из автобуса на снег, а ее хотели оставить? Если видели-слышали, отзовитесь! Это было недалеко от костела, что на площади Свободы, в двенадцатом часу ночи 19 декабря.

Вот пересчитали наловленных «овец» (одного подхватывают выходящим из кафе, подбирают парочку на остановке, штуку другую-третью пьяненьких мужиков для коллекции добавляют), доложили по телефону: «Около сорока», — и расслабились. Автобус тронулся, из шлемов высунулись человечьи головы.

И эти головы отвечали на выкрики отловленных, спорили и даже аргументировали. Ведь спорил же волк с ягненком в крыловской басне.

— Вы совершаете беззаконные действия! Вы забрали ни к чему не причастных людей!

— Да ладно вам! Как кидать камни, так нормально, да?

— Кто кидал камни? Вы что? Вот она? Или он? У него, бляха, рук же нет!!!

Только языки были очень разные. Перебранка была долгой, но состояла она не в обмене мнениями, а в трении друг о друга противостоящих мировоззрений. У омоновцев, по крайней мере, у самого словоохотливого из них, сидевшего за рулем, оно было зимне-безоблачным: в стране порядок и более или менее нормально, потому что в России и Украине, например, хуже; а порядок нужно защищать. От «вас». «Вы», то есть мы, представлялись ему некоей цельной зловредной массой — «оппозицией», хотя именно рядом с ним сидели анархо-демократ, набожная православная, ультралевый социалист, художница и подгулявший именинник с осоловевшим аполитичным взглядом.

Что же? Значит, прохожих (нас, в том числе) брали по причинам... философским, скажем так. Не за конкретную вину. Даже не за то, что мы могли быть из толпы митинговавших — время к полуночи, бунтари далеко-далеко. А потому, что раз начальство из телевизора предупредило народ: лучше сидите дома, то всякий оказавшийся поздно вечером в центре города — или враг, или дурак. Врагов нужно давить, дураков — наказывать. Спорить можно было сколько угодно, но «вотще». Это был не юридический акт. А охота.

Под конец общительный водитель заверил своих взбудораженных собеседников: «Мы вас не арестовывали. Мы вас просто пригласили для выяснения личности. Подвезли. Там посмотрят по видеозаписи, совершали вы противоправные действия или нет. Не совершали — отпустят».

Лгал. Или шутил. Или сам обманут. Мелкой лжи, мелкого хамства, мелких издевательств и пакостей в эти сутки была целая туча — она сопровождала нас повсюду в путешествии по нутру механизма «правопорядка». Тик-так...

В Ленинском РОВД нас вместил подвальный актовый зал. Впереди (в советские времена там обязательно красовался бы портрет Ленина или текущего генсека) — царственный жидкокристаллический телевизор. На боковой стене — стенд с пресловутым соком «Садочок» и гайками — бомба, препарированная, словно лягушка для школьного урока зоологии. Когда добыча распределилась по партеру, на помост вышла вся честная компания милиционеров и омоновцев. Омоновцы, несмотря на усталость, похожи на разогревшихся в бою кентавров (глаза — человека, тело — принадлежит государству), милицейские люди рыхлее, осадистее, в среднем старше. У всех — широкие округловатые лица, полные сильного красного мяса внутри. Вышли как артисты на сцену и стали. Молча уставились в зал — на нас. Дюжина пар профессионально равнодушных глаз. Внимательно и не торопясь. Словно ощупывая, пытаясь всех запомнить.

Зал (кто тут публика — мы или они?) был достаточно молчалив, только **budimir** с **dolka777** ярились и забрасывали господ профессионалов сердитыми вопросами. Те не реагировали или нехотя отбрехивались.

И потянулись утомительные своей бессмысленностью часы: тик-так. На сцене вялое распределение ролей и раскладка бумаг. Солировал полковник с лицом пожилого токаря, ни доброго, ни злого, привыкшего трудиться над бездушными железками. Железки — мы. Коварные, дурные. А сегодня еще и сверх плана.

В зал: «Несовершеннолетние есть?» Не имеется. В телефон: «...Фабул не подготовили» и «Мальчиков мне привези несовершеннолетних».

Фабулы — что по латыни попросту «небылицы», как мы выяснили, это стандартные тексты, описывающие якобы совершенное нами правонарушение. У всех одинаковые были эти небылицы, одна в одну. Мальчиков же нужно было наловить, чтобы предъявить потом народному вниманию:

вот-де обманутые и подбитые лидерами на хулиганство юнцы. Вроде, слышали мы, поймали потом для полковника желательных мальчиков.

После нескольких часов подготовки приступили к обработке добытого материала. Вызывали по списку пойманное существо, уточняли возраст и отдавали милицейскому чину, который вел полученное к себе в уголок. Там уже были приготовлены протокол с фабулой и два омоновца, чтобы его залжесвидетельствовать.

— На митинге были?

— Нет.

— Что ж вы так несмело. Смелее нужно, честнее: да, был. Вот это я понимаю.

— Иногда требуется мужество признать, что не делал чего-то.

Вспоминаю суд карточной Королевы над Валетом. Рядом веселый, озорной, с наголо обритой головой офицер, похожий на белогвардейского контрразведчика, допрашивает жену мою:

— Значит, вас задержали около площади Свободы. Так-та-а-к... Советская, 11. Это адрес площади Свободы.

— Не подписывай это! — говорю жене. — Или подпиши и добавь, что неправильно указаны место и время.

Белогвардеец любезно согласился и сказал моей жене и своей допрашиваемой: не имеет значения, что она напишет, что подпишет или откажется подписать. «Гляньте: мы всем даем одно и то же. Только мужской род на женский меняем. А Вы что смотрите?» Это он мне, заглядывающему из-за плеча.

*Белорусская журналистка Татьяна Бубликова, работающая на польскую компанию «N.E.W.S. Informacje», была задержана поздним вечером 19 декабря у метро «Площадь Независимости». На доводы, что она репортер, а также на предъявление журналистского удостоверения и документа с редакционным заданием, спецназовцы не обратили внимания. Таню вместе с другими людьми, среди которых был и репортер Анджей Почобут (корреспондент «Gazety Wyborczej»), забросили в автобус типа «сотки», после чего отправили по маршруту через Окрестина в РУВД Октябрьского района.*

— В автобусе кто-то возмущался, кто-то старался передать побольше информации близким по телефону, у кого-то был тихий шок. Я постоянно плакала, — *рассказывает Таня.*

**«В РУВД Октябрьского района ко мне подошли милиционеры и, чтобы удалось сделать фото, стали держать голову руками»**

— В РУВД Октябрьского района я все время возмущалась: почему задержана, какие предъявляются обвинения? Из-за этого меня отправили на ночь в дежурку, — *продолжает рассказ коллега.* — В дежурке было несколько человек. Один — постоянно кашляющий, второй — сексуально озабоченный, который под смех милиционеров несколько раз объявил, что хотел бы со мной переспать.

Под утро меня повели на досмотр. Там, в большом зале, по периметру сидели милиционеры — видимо, отдыхали. Центр помещения, где стояли я и досмотрщики, был как будто сценой. Женщина ощупывала меня без эмоций, а сотрудник милиции Н. Колесников (имени не знаю) осматривал мои одежду и сумку. Он постоянно отмачивал сальные шутки сексуального характера, переходил на крик, близко наклонялся к моему лицу, всячески хотел меня унизить. За этим процессом наблюдали все те, кто сидел по периметру, и смеялись.

У меня очень быстро сдали нервы. Я рыдала. Колесников вывалил содержимое сумки на стол. И, увидев листок с моим редакционным заданием, с подколкой сказал: «А! Так ты у нас кооорреспонде-е-ентка!»

Меня никогда не насиловали. Но, кажется, что именно в таком состоянии находятся люди, которых изнасиловали. В тот момент я пережила публичное психологическое групповое изнасилование.

*После досмотра, примерно в 9.00 20 декабря, Таню повели на дактилоскопию. Она отказалась сдавать отпечатки,*

*ссылаясь на то, что ее статус неясен и в связи с этим у правоохранителей нет полномочий проводить процедуру.*

— Я сжала руку в кулак, — *вспоминает Таня.* — Тогда один сотрудник начал выкручивать руку, пытаясь разжать пальцы. Плача, я держалась до последнего. За всем этим действом наблюдала женщина в погонах. Она смотрела на меня — и ей было все равно. Наконец, им это удалось. Моя рука стала черной — отпечатки взяты. И тогда меня перевели в другую комнату — фотографировать. Там со злости я вымазала чистейший белый подоконник черной краской. Кричали, но стало безразлично. «Фотограф» спросил, хочу ли фотографироваться. Отказалась. Тогда ко мне подошли милиционеры и, чтобы удалось сделать фото, стали держать голову руками. Все лицо к этому времени у меня было черное — от туши и черной краски. Позже поняла, — когда ту же процедуру все женщины прошли уже в ИВС, — что в РУВД пальчики и фото срочно делали для КГБ.

### Подземелье Дома правосудия

*В Доме правосудия с Таней и другими женщинами еще до суда обращались как с арестантами. Ее и еще четверых отвели в подземелье, где посадили в камеру размером «с четыре холодильника» (такие камеры называют «стаканом»). Сидеть всем было невозможно. Так что женщины присаживались на пол по очереди.*

— Охранница с грубым голосом на просьбу дать воды отвечала: «Пить в туалете». Но, когда нас водили в туалет — там никто не пил. Вода была горячая, — *продолжает Таня.* — Уже в зале суда попросила воды у охранников. Не дали, хотя сами у нас на глазах попивали кока-колу. Две бутылочки принес журналист «Еврорадио». Спасибо ему большое за это.

### Изолятор с «человеческим» лицом

*В ИВС Татьяна Бубликова, которая по рекомендации адвоката согласилась с обвинениями, что «участвовала в несанкционированной акции» (рассчитывала на штраф и свободу), попала на 10 суток административного ареста.*

— В ИВС работают нормальные люди, — *сравнивает журналистка.* — С нами не говорили матом, выводили в туалет, предлагали воду. Охрана закрывала глаза, когда в туалете те, у кого были телефоны, писали СМС близким.

Задержанные и осужденные женщины пережили полный досмотр. Со снятием нижнего белья и раздвиганием ног. После этого всем нам раздали матрасы, покрывала (последним не хватило, поэтому в камерах накрывались пальто и куртками) и развели по камерам.

Нас в камере, рассчитанной на 8 человек, сидело 13. Сидели — это в буквальном смысле. На самом деле сидеть можно было или на полу, или на лежанке. Полноценно ходить было невозможно — только переступая через людей, которые лежат. 23 декабря к нам подселили еще одну женщину — не «политическую», избившую свою свекровь. Ей вовсе пришлось лечь на проходе. «Контрольным выстрелом» стало то, что в «Комсомолке» написали о том, что у нас трехразовое питание, а на самом деле кормили дважды в сутки. Нервы сдали, хотя мы старались держаться и даже, чтобы размяться, по вечерам занимались гимнастикой и йогой. Мы потребовали улучшения условий содержания.

Начальник ИВС Владимир Нагибо, которому я и еще несколько женщин передали заявление, просто засунул его в карман. Он даже не выслушал. Это очень расстроило, мы были подавлены. Нас расселили только на следующий день. Это произошло после того, как у моего адвоката состоялся разговор с начальником.

Я и еще две женщины оказались в «двушке». Голодовку многие прекратили (в том числе и я), хотя кто-то продолжал голодать. Дело доходило до обмороков.

Вообще, в тюрьме сложно ощущать себя женщиной. У нас не было зеркал, мы были вонючие, хотя не чувствовали этого, привыкнув к запаху. Передавали друг другу ароматизированный крем для рук, — только чтобы понюхать. Так хотелось свежести.

Перед тем, как мы должны были выйти на свободу, начальник ИВС Владимир Нагибо вручил нам квитанции. В них значилось, что за каждый день содержания мы должны 7 тысяч рублей. «Надеюсь, вы не будете дядю Володю у изолятора сторожить», — сказал он на прощание, имея в виду, что кто-то из нас станет ему мстить.

### Наш разговор

*Это интервью я брала у Тани на следующий день после ее освобождения. Она рассказывала о своих «приключениях» методично, почти без эмоций. Зато я, на другом конце провода, не смогла сдержать слез из-за несправедливости и таких издевательств.*

— Ты в школьных столовых дежурила? — *вдруг спросила Таня.*

— Да...

— Помнишь, как тряпки воняют?

— Да.

— Я приехала домой, вошла в ванную комнату, понюхала одежду и волосы и поняла... Я пахну, как та самая тряпка. Это отвратительно.

### Свобода в несвободной стране

*В тот же день, 30 декабря, Таня обжаловала в суде высшей инстанции свой приговор. Решение было, как и предполагалось, не в ее пользу. Суд посчитал, что приговор первой инстанции был объективен.*

*После этого Татьяна — журналистка, которая несколько месяцев назад переехала работать в Минск и воодушевленно делилась планами на будущее, — без оглядки рванула на новогодние праздники домой, в Гомель.*

— Сегодня я сильно не плачу, — *подытожила тогда Таня.* — Только несколько раз в день. Думаю о доме, о родных.

*А через две недели мы встретились с ней на Немиге. Бубликова сменила цвет волос на «спелую вишню» (то есть теперь не рыжая и не блондинка). В ответ на комплименты, смущаясь, улыбалась.*

— Ты уже много обдумала. Так чего там не хватает больше всего? — *поинтересовалась я.*

— Самое страшное — недостаток информации. Так что каждую газету мы читали вслух и пускали ее по кругу, чтобы можно было рассмотреть фотографии. А еще — не хватает любимого человека рядом, — *смеясь, добавила она.*

Шутница :)



# «Працоўныя» моманты

**Пры разгоне грамадзянскай акцыі 19 снежня на плошчы Незалежнасці ў Мінску пацярпелі нашыя калегі. Пацярпелі, бо выконвалі свае прафесійныя абавязкі, пацярпелі, бо выкарыстоўвалі сваё права знаходзіцца ў самай гушчы падзей, пацярпелі, бо забяспечвалі канстытуцыйнае права грамадзян Беларусі на атрыманне аб'ектыўнай інфармацыі...**

Вось такая яна, праца незалежных журналістаў — непрадказальная, рызыкоўная і нават небяспечная.

Але мы выконваем сваю справу. Пераступаючы праз боязь атрымаць амапаўскай дубінкай па галаве, пераадольваючы элементарную ўласную асцярогу. Напэўна, таму, што па-іншаму не ўмеем. А яшчэ мы не хочам і не будзем маўчаць. Інакш краіна будзе жыць у немаце.

Вечарам 19 снежня на плошчы Незалежнасці сярод іншых працавалі карэспандэнт газеты «Новы час» Вольга Хвоін і журналіст інтэрнэт-газеты «Салідарнасць» Руслан Гарбачоў.



### Вольга ХВОІН: «Я не магу сказаць свайму сумленню: «Маўчы!»

*— Вольга, што ты ўбачыла на плошчы, што цябе здзівіла і, магчыма, збянтэжыла?*

— Насцярожыла тое, што людзей пусцілі на пляцоўку перад Домам урада, за помнік Леніну. Вулічныя акцыі амаль ніколі не адбываюцца на гэтай плошчы. А калі дэманстранты туды і даходзяць, то супрацоўнікі спецслужбаў не пускаюць людзей далей за помнік. А ў гэты раз людзі маглі падысці да самых дзвярэй. Было адчуванне, што падзеі разгортваюцца не традыцыйна, а па нейкім невядомым плане.

Калі пачалі біць вокны, дзверы ў Доме ўрада, лідары апазіцыі былі не радыя такому павароту падзей. Калегі гаварылі, што Андрэй Дзмітрыеў у адчаі выкрыкнуў: «Да гэтага мы перамагалі, а цяпер — канец!»

Разабрацца ў хітраспляценнях палітыкі, якая ў Беларусі робіцца насамрэч не на плошчах, а ва ўладных калідорах, няпроста. Але тое, што ў Доме ўрада былі спецназаўцы, якія не выйшлі адразу, каб абараніць будынак, выклікае мноства пытанняў...

*— Вольга, у цябе немалы досвед працы падчас вулічных акцый. Ці было прадчуванне жорсткага разгону маніфестацыі?*

— Так. Я пастаралася адшукаць найбольш небяспечнае месца з добрым сектарам агляду. Таму пачатак разгону, манеўры сілавікоў былі як на далоні.

Уразіла, як супрацоўнікі ў цывільным групамі па 5–8 чалавек выхоплівалі людзей з натоўпу і збівалі іх нагамі. Увогуле ўсё выглядала даволі брутальна.

У пэўны момант я апынулася на ўжо «зачышчанай» тэрыторыі і зразумела, што ў такім вэрхале наўрад ці хто будзе глядзець на маю прэс-карту. Вырашыла абмінуць натоўп з боку педуніверсітэта, але трапіла ў людскі вір, які да таго ж пачалі з трох бакоў сціскаць амапаўцы. Натоўп проста некуды нёс — па клумбах, бардзюрах. Баялася паслізнуцца і зваліцца. Апынулася ў месцы, дзе шэрагі амапаўцаў, вайскоўцаў з дубінкамі і шчытамі амаль сышліся. Спрабуючы вырвацца, я пачала крычаць вайскоўцу, што я журналіст, прэса! У адказ пачула брыдкую лаянку, потым гэты «прадстаўнік правапарадку» схапіў мяне за горла са спіны, штурхнуў на шчыты амапаўцаў. Але я зноў вярнулася да вайскоўца з тымі ж словамі, на што ён у чарговы раз абклаў мяне матам, схапіў за горла, а потым проста выкінуў на праезную частку. Добра, што рух транспарту на той момант быў часткова спынены.

Пазней, аналізуючы гэтыя падзеі, прыйшла да высновы, што людзей ратавалі зімовая вопратка, шалікі-пальчаткі. Інакш бы сінякоў ад моцных удараў было значна больш. Пасля ўбачанага магу сказаць: на тое, што ты журналіст ці дзяўчына, ніхто не зважаў. Натоўп быў асляплены страхам, а амапаўцы-вайскоўцы — шалам бойкі. Я разумею, што ў такіх сітуацыях у чалавека адбываецца моцны выкід адрэналіну, працуюць інстынкты, а не розум. Аднак ведаю і тое, што мяжа апантанасці сілавікоў залежыць ад каманды зверху.

*— На тваю думку, ці быў адмысловы загад «нейтралізаваць» менавіта журналістаў?*

— Не магу сказаць, ці быў такі загад, але думаю, што была каманда не цырымоніцца з намі і класці ўсіх тварам у асфальт. Што з прэсай і рабілі. Бо, калі ёсць загад не чапаць журналістаў падчас масавых акцый, то гэта збольшага выконваецца.

*— Ты на ўласным досведзе даведалася, што незалежная журналістыка ў Беларусі — прафесія небяспечная. Пасля ўсяго, што ты перажыла, не ўзнікла жадання сысці з прафесіі?*

— Жадання сысці з прафесіі не было. Але паменела талерантнасці ў дачыненні да людзей, якія хлусяць на дзяржаўных тэлеканалах і са старонак афіцыйных газет, якія бароняць сістэму, што трымаецца на сіле, а не на законе.

Для тых, хто працуе ў сферы СМІ ў Беларусі, цяпер ёсць некалькі варыянтаў пабудовы жыцця, прафесійнай дзейнасці. Працаваць у незалежнай прэсе, рызыкаваць стратай нерваў, маёмасці, а часам і здароўем. Ці працаваць у дзяржаўнай прэсе, сказаць «Маўчаць!» свайму сумленню і думаць толькі пра баршчы, рыбалку, кветкі. Я такога не хачу. Можна, канешне, увогуле сысці з прафесіі. Ці з'ехаць за мяжу і там наноў будаваць сваё жыццё, кар'еру. Аднак тым, хто абярэ першы і апошні варыянты, будзе надта няпроста.



## Руслан ГОРБАЧЕВ: «Пока меня били, я даже не пытался встать»

— Я пришел на Октябрьскую площадь в Минске около 20.00, наблюдал за происходящим с самого начала. Вместе с толпой дошел до площади Независимости. И, ты знаешь, сперва у меня было четкое ощущение того, что ничего не предвещает столь брутальной развязки. Потому что никто из кандидатов в президенты, присутствовавших на митинге, не собирался ломать двери. Проходила обычная гражданская акция. Люди стояли у памятника Ленину. Я был свидетелем того, как экс-кандидат в президенты Андрей Санников сказал, что он и еще несколько человек идут на переговоры в Дом правительства.

И тут началось: несколько человек выскочили из толпы и, как по команде, начали бить двери Дома правительства. Я четко видел, как Виталий Рымашевский пытался остановить людей, которые начали бить окна, а Санников вместе с женой Ириной Халип находился перед ступеньками Дома правительства и даже не пытался на ступени подняться.

Позже я увидел, как с разбитой головой вышел из толпы Рымашевский. Я обратил на это внимание нашего фотографа. В этот момент на площадь выбежал спецназ, бойцы начали оттеснять людей от входа в Дом правительства.

*— Как я понимаю, ты просто не успел вырваться из оцепления...*

— Можно и так сказать. Я наблюдал за происходящим с левой стороны от Дома правительства — спецназовцы «отсекли» меня от основной массы людей, и я оказался прижатым к стене. У стены стояли пять человек в штатском. Когда я проходил между ними и бойцами спецназа, которые выстроились в многорядные цепочки, один подскочил ко мне и с криком: «Иди сюда!» — ударами в грудь и плечи повалил меня на землю, а его соратники принялись избивать меня ногами.

*— Прокричать о том, что ты журналист, успел?*

— А что толку? На мне был бэйдж с надписью «Пресса»... Когда я упал и меня начали бить, я, конечно, закричал, что я журналист. Может быть, это меня в какой-то степени и спасло от серьезных увечий. Когда они меня били, я даже не пытался встать...

Через какое-то время они меня подхватили и вытолкнули. Сознания я не терял. Когда меня избивали, то сорвали бэйдж. Из переделки я вышел практически целым: переломов не было, только ссадины на руках.

*— Извини за банальный вопрос, тебе было страшно?*

— Было. Особенно за разгоном людей со стороны было очень страшно наблюдать.

Представь, ты видишь, как спецназовцы бьют дубинками безоружных людей, как дубинки опускаются на головы... Ты стоишь в оцепенении и ничего сделать не можешь. А те, кто орудует дубинками, чувствуют свою безнаказанность и неоправданно, с остервенелой жестокостью, применяют силу к безоружным людям, вина которых только в том, что они пришли узнать о результатах выборов. Страшно...

*— Руслан, как, на твой взгляд, работать журналисту в стране, где постоянно нарушаются гражданские и профессиональные права?*

— Так же, как и раньше. Каждый из нас стоит перед моральным выбором, как и где работать. Так вот, я уверен, что журналисты, которые работали на площади, — настоящие профессионалы. Никто из них не нарушал общественный порядок, они просто выполняли свою работу. А как иначе? Ну не будешь же наблюдать за происходящим за 500 метров от событий?

И, ты знаешь, размышляя о том, что произошло в Беларуси 19 декабря, я только утвердился в мысли, что сейчас в государственные СМИ я работать не пойду ни за какие «коврижки». Я не понимаю, зачем туда идти и что там делать. На что тратить свои силы? Ведь там скорее платят за то, чтобы ты не писал о том, что видишь и чувствуешь.

# Тюремная география

В то время, когда наших коллег, осужденных по надуманным и ничем не подкрепленным обвинениям, отправили «отбывать сутки» в следственные изоляторы, БАЖ делала все возможное, чтобы арестованные журналисты не чувствовали себя брошенными.

Мобильные группы волонтеров каждый день курсировали по маршруту: офис БАЖ — изоляторы. О том, кто и как оказывал помощь отбывающим административный арест независимым белорусским журналистам, рассказывает заместитель председателя Ассоциации **Андрей АЛЕКСАНДРОВ**.

— Поздно вечером 19 декабря в офис БАЖ стали звонить журналисты, которых задержали во время освещения акции. Они звонили прямо из «автозаков», переполненных людьми. Мы пытались давать им какие-то рекомендации. Утром 20 декабря в БАЖ начали составлять список задержанных и пострадавших журналистов. После того как прошли мероприятия, которые в Беларуси называются судами, и наших коллег «запаяли» на сутки, мы начали оперативно решать вопрос с передачами для арестованных.



Фото Алеся Пилецкого

Уже 21 декабря, в первые сутки отсидки наших коллег, мы повезли передачи членам БАЖ, которые находились в изоляторах на ул. Окрестина и ул. Скорины.

Ты знаешь, я был приятно поражен тем, что некоторые наши коллеги, члены организации бросили дела, позвонили в офис и вызвались работать волонтерами.

Надо сказать, что мы наладили эффективную систему. Работал штаб, кто-то занимал очередь возле изоляторов, кроме того была мобильная группа, которая передвигалась по маршруту от магазина до изолятора.

*— Как принимают передачи для задержанных в Беларуси?*

— Существует общий для изоляторов перечень того, что можно передавать.

Но у меня лично сложилось впечатление, что список этот абсолютно разный в разных изоляторах.

Например, некоторые наши коллеги сидели в Жодино — там одни правила, на Окрестина в Минске — другие, на Скорины — третьи. Причем эти правила могли меняться несколько раз в течение дня. Я думаю, что это зависело от присутствия или отсутствия гуманизма в сознании каждого конкретного дежурного милиционера в конкретный промежуток времени. Например, на Скорины принимали спальники, а на Окрестина не брали.

В один из дней поступила информация о том, что в изоляторе на Скорины берут еду. В первый раз, когда мы привезли туда передачу Тане Бубликовой и Юле Дранчук, из еды ничего не приняли, а только средства гигены и спальники.

Мы купили печенье, апельсины, яблоки. Эту передачу я и повез в изолятор. А там очень симпатичная сотрудница милиции пристально посмотрела на пакет с яблоками, сетку с апельсинами и пачку печенья. Потом все вскрыла и сказала: «Я могу передать два яблока и два апельсина». Взяла несколько печенюшек. Все остальное мне вернули под роспись.

Или вот еще случай, который поизошел накануне католического Рождества. Я повез передачу на Окрестина члену БАЖ Алексею Шеину. А там в тот день было два списка. Я не знаю, по какому принципу их составляли. Скорее всего, по принципу «политические» и «случайные». Крупная женщина на приемке довольно грубо меня встретила, вообще не заглянула в мой пакет. Только попросила написать на листке с перечнем того, что я передаю, мой телефон и номер паспорта. Бросила эту бумажку в пакет с передачей и куда-то ушла, предварительно указав мне на дверь. Я не уверен, что Алексей эту передачу получил…

*— Некоторые члены БАЖ до сих пор находятся в СИЗО КГБ.*

— В этой «конторе» своя специфика: передачи принимают с 10.00 до 12.00 три раза в неделю. В такие дни там очередь, и люди не всегда успевают уложиться в отведенный промежуток времени. Я два раза возил передачи члену правления БАЖ Сергею Возняку, и очередь почему-то на мне заканчивалась. Соблюдая все «письменные формальности», в КГБ за 2 часа успевают принять не многих. И даже видя, что в очереди остается 3–4 человека, в 12.00 прием передач заканчивают. Жаловаться некому и бесполезно.

Кстати, в канун Нового года в СИЗО КГБ поменялись правила. Если раньше принимали домашнюю еду, то 31 декабря объявили, что ничего такого больше брать не будут. Причем, людей заставляли переписывать заявления с перечнем продуктов, что значительно затягивало процесс передачи.

*— Не видел ли ты у стен изоляторов коллег из государственных изданий? Ведь пострадали журналисты и из таких СМИ.*

— Нет, не видел. И вообще, то, как освещали события 19 декабря государственные газеты и телеканалы, заставило меня усомниться в том, что мы с ними едины в призвании. Несколько последних лет, когда казалось, что диалог возможен, БАЖ пыталась идти на контакт с Белорусским союзом журналистов, задумывались совместные проекты с коллегами из государственных СМИ.

Наша позиция изменилась не сильно: мы за диалог, мы должны обсуждать наши общие профессиональные проблемы. Но то, как государственные СМИ освещали события 19 декабря и в последующие дни, не совместимо с понятием профессиональной этики. Мне неприятно это комментировать. Тут, как говорится, каждый выбирает по совести.

*Падрыхтаваў Віталь ГАРБУЗАЎ*

# Журналісты сталі ворагамі?

**Тое, што 19 снежня ў аўтазакі і міліцэйскія аўтобусы трапілі журналісты, нельга назваць выпадковасцю. Цягам двух апошніх гадоў фотакарэспандэнты, аператары, рэпарцёры сутыкнуліся з істотнымі перашкодамі для сваёй прафесійнай дзейнасці з боку сілавікоў.**



*Любоў ЛУНЁВА*

Увечары пасля выбараў рэпарцёры, вядома, былі з тэлекамерамі і мікрафонамі. Амаль у кожнага на вопратцы — пасведчанне, добра бачнае за некалькі метраў. Міліцыя колькі гадоў запар настойвала на такіх «апазнавальных» знаках ды БАЖ раіла: у месцах здарэнняў, масавай актыўнасці журналіст выконвае свой прафесійны, абумоўлены законам, абавязак. Таму павінен працаваць адкрыта, што называецца, «без страху і папроку».

«Без страху і папроку» пэўны час амаль атрымлівалася ў сярэдзіне 90-х. Многія з нас памятаюць, што тады шматлікая рэпарцёрская каманда імкліва збіралася, ледзь пачуўшы пра не любімыя ўладамі вулічныя акцыі. Апекаваўся ж над намі Дзмітрый Партон, прэс-сакратар МУС. Элегантны, у стылёвым паліто, ён заўжды быў ветлівы, у добрым настроі. І — што па цяперашніх часах дзіва! — не дзяліў нас на штатных і пазаштатных, «чэсных» і «нячэсных», добра разумеючы: той, каму наканавана пісаць, усё адно напіша, знойдзе спосаб данесці да слухача і чытача інфармацыю пра падзеі з бурлівых вуліц.

Байцы спецпадраздзяленняў тады таксама лютавалі. Але Партон неаднойчы станавіўся паміж рэпарцёрамі і АМАПам.

Цяперашні штат прэс-афіцэраў у сініх камізэльках мае моду збіцца ў купку дзенебудзь падалей — і ад рэпарцёраў, і ад дэманстрантаў. Міліцэйскае начальства ўвогуле вельмі хацела, каб падчас вулічных акцый журналісты арганізавана стаялі ў агароджаным «загоне». Але прафесія вымагае бачыць і чуць не толькі тое, што жадае міліцэйскае начальства. І рэпарцёры ідуць у гушчыню падзей, дзе разлічваюць толькі на сябе і напісанае на



бэджах слова «прэса». Мы ўжо забыліся, а шмат хто і не ведае, што ў асобе прэс-афіцэра МУС да нас і павінны прыходзіць дапамога і абарона. Як пацверджанне, між іншым, пэўных палажэнняў Закона аб друку.

Прэс-афіцэраў у той вечар на плошчах увогуле не было заўважна. Ні на Кастрычніцкай, ні на пляцы Незалежнасці.

Тое, што журналістаў штурхалі, некаторых збівалі з ног, білі дубінкамі па галаве і па руках, яскрава сведчыць: салдаты ўнутраных войскаў і міліцыянеры, калі і мелі, то зусім не абарончыя інструкцыі ў дачыненні да прэсы. Можна, канешне, дапусціць, што інструкцый увогуле не было і таму дзейнічалі «па абстаноўцы». Але цяжка паверыць, што сілавікі нават праз шчыліны шлемаў не бачылі аб'ектываў, мікрафонаў, бэджаў з надпісам «прэса»…

За паўгадзіны да таго, як зачыніліся ўчасткі для галасавання, на вуліцы Няміга, каля штаба Уладзіміра Някляева, карэспандэнтаў пад акампанемент выбухаў шумавых гранат кідалі тварам у снег. Нікому не дазвалялі здымаць. Спецназаўцы зрэагавалі толькі на вокліч: «Мы — первый канал!» Узялі з сабой гэтую групу. А калі праз пэўны час высветлілі, што той «первый» — расійскі, сказалі: «Не з тымі, хлопцы, працуеце…»

Быў час, ужо пасля Партона, калі спецназаўцы мелі загад не чапаць журналістаў. І нават падчас нейкіх сутычак рабілі калідор ці выцягвалі рэпарцёраў з натоўпу, кантралявалі, каб прадстаўнікоў прэсы не «загрузілі» ў аўтазак. Калі ж высвятлялася, што разам з затрыманымі ўдзельнікамі акцыі ў міліцэйскі пастарунак трапілі журналісты, іх адпускалі. Канешне, нельга казаць, што ўсё было ідэальна. Натуральна, не абыходзілася без эксцэсаў, але на вулічных акцыях працаваць было значна лягчэй, чым у апошнія два гады.

На пачатку 2009 года ўсё рэзка змянілася. Тыя ж спецназаўцы падчас так званай зачысткі пачалі закрываць спінамі і далонямі аб'ектывы тэлекамер, штурхаць журналістаў. Бывала, што карэспандэнтаў папросту абступалі і не давалі здымаць.

Узгадайма: менавіта гэткім чынам у 2000 годзе дзейнічалі салдаты вайсковай часці № 5448 на плошчы Якуба Коласа. Тады міністрам унутраных спраў быў Юрый Сівакоў. У той год 25 сакавіка на журналістаў вялося паляванне. Рэпарцёраў закідвалі ў аўтазакі (яшчэ старога ўзору), потым адвезлі на тэрыторыю вайсковай часці, што на вуліцы Маякоўскага, дзе больш як 40 чалавек зачынілі ў ангары.

Дык, можа, у гэтай гісторыі і крыецца адказ на пытанне: што здарылася са спецназам за апошнія два гады? Сёння бясстрашнымі байцамі кіруе былы камандзір той самай брыгады ўнутраных войскаў Аляксандр Лукомскі…

Журналісты недзяржаўных выданняў, якія і без таго адчуваюць прэсінг з боку ўладаў, цяпер не могуць паводле закону свабодна асвятляць падзеі падчас вулічных акцый. Збіццё ж спецназаўцамі затрыманых у аўтазаках і мікрааўтобусах стала звычайнай практыкай. Зламаную тэле- і фотаапаратуру, чэрапна-мазгавыя траўмы мы фіксуем амаль пасля кожнай вулічнай акцыі. Няўжо гэта задавальняе цяперашняе кіраўніцтва МУС? Наўрад ці, бо зняславіліся на ўвесь свет. Дык, шаноўныя палкоўнікі ды генералы, выпраўляйце сітуацыю. Ці гэта не ў вашай кампетэнцыі?

Дарэчы, АМАП стваралі ў 90-я менавіта з мэтай аховы грамадскага парадку падчас масавых акцый. Мэта ўключала ў сябе і разгон гэтых акцый. Бо трагічныя падзеі ў Тбілісі прымусілі тады наш урад тэрмінова стварыць адпаведныя падраздзяленні, распрацаваць тактыку іх паводзінаў і вызначыць межы ўжывання сілы супраць мірнага насельніцтва. Для гэтага падбіраўся персанал, складаліся адпаведныя інструкцыі, праводзілася навучанне.

Камандзіры павінны былі сачыць за падначаленымі. Нельга было дапускаць празмернага ўжывання сілы, нецэнзурную лаянку, ствараць сітуацыю, калі ў натоўпе магла ўзнікнуць паніка і г. д.

А што цяпер? АМАП, які сёння стаў палком міліцыі спецыяльнага прызначэння, забыўся на інструкцыі сваіх заснавальнікаў? Ці шараговыя байцы, якія і раней не вызначаліся асаблівым тактам, атрымалі «адмашку» ад новых камандзіраў і дзейнічаюць па прынцыпе «вайна ўсё спіша»?

Дарэчы, гісторыя былых савецкіх рэспублік сведчыць, да чаго прыводзіць падобная тактыка сілавікоў. Можа, таму мы іх цяпер і называем былымі…

# RE-pressing:

## Захад шакаваны дзеяннямі беларускіх уладаў у дачыненні да журналістаў

**З першага дня за падзеямі ў Беларусі і гвалтам у дачыненні да журналістаў сачылі дзясяткі міжнародных праваабарончых арганізацый. Заявы пратэсту прымалі і нацыянальныя журналісцкія саюзы, і транснацыянальныя карпарацыі, і палітычныя інстытуцыі.**

Амаль 30 нашых калег былі затрыманыя, столькі ж — збітыя. Паламаная і адабраная апаратура стала толькі пачаткам вялікага «зносу» камп'ютараў, ноўтбукаў, дыктафонаў і відэакамер, якія канфіскоўвалі ў рэпарцёраў і з рэдакцый цягам наступных тыдняў.

Супраць сілавых дзеянняў у дачыненні да беларускіх і замежных журналістаў выступілі АБСЕ, Міжнародная федэрацыя журналістаў, «Рэпарцёры без межаў», Саюз журналістаў Расіі, украінскі рух «Стоп цэнзуры!», Саюз журналістаў Літвы, Асацыяцыя журналістаў Іерусаліма (JAJ), Нарвежскі саюз журналістаў, Сетка Дамоў правоў чалавека, Amnesty international, Камітэт абароны журналістаў (CPJ), Асацыяцыя польскіх журналістаў і многія іншыя.

«Міліцыя павінна дапамагаць рэпарцёрам, якія перадаюць інфармацыю з месца публічных падзеяў, а не біць і запалохваць, разбіваць іх абсталяванне і знявольваць іх», — адзначыла ў сваёй першай заяве прадстаўніца АБСЕ ў пытаннях свабоды СМІ Дуня Міятавіч.

Праз некаторы час спадарыня Міятавіч зноўку вярнулася да тэмы ціску на журналістаў у Беларусі, накіраваўшы ліст на імя міністра замежных спраў Сяргея Мартынава. У ім прадстаўніца АБСЕ патрабавала вызвалення з-за кратаў журналісткі расійскай «Новой газеты» Ірыны Халіп і рэдактаркі «Хартыі-97» Наталлі Радзінай.

Дуня Міятавіч запэўніла беларускія ўлады, што гатовая ў хуткім часе наведаць Мінск і праз офіс АБСЕ ў беларускай сталіцы дапамагчы Беларусі вярнуцца да нормаў свабоды сродкаў масавай інфармацыі. Вось толькі ці будзе працаваць у Мінску той самы офіс — пакуль пытанне адкрытае.

Міжнародная федэрацыя журналістаў абвінаваціла беларускія ўлады ў «гвалтоўным запужванні і запалохванні» журналістаў, якія асвятлялі мірную акцыю пратэсту ў Мінску 19 снежня.

«Беларусь ніколі не дасягне статусу дэмакратычнай краіны, пакуль яна сістэматычна здзяйсняе гвалт у дачыненні да незалежных медыяў і свабодных журналістаў. Без свабоды прэсы дэмакратыя немагчымая», — дадаў Эйдан Уайт, генеральны сакратар МФЖ.

Шакаваная ціскам на журналістаў была і міжнародная праваабарончая арганізацыя «Рэпарцёры без межаў». Тым больш, што падчас перадвыбарчай кампаніі беларускія ўлады не толькі на словах дэкларавалі лібералізацыю ў краіне, але і рабілі рэальныя крокі ў гэты бок. Напрыклад, акрэдытавалі на выбары ў краіне каля 400 замежных журналістаў, што было рэкордам у параўнанні з папярэднімі выбарчымі кампаніямі.

Між тым затрыманні і збіццё журналістаў паказалі, што ўлады не гатовыя «мірыцца» з прафесійным і адказным стаўленнем рэпарцёраў да сваіх абавязкаў, з іх прысутнасцю не толькі на прэс-канферэнцыях, але і на месцах падзеяў.

«Рэпарцёры без межаў» выказалі свой пратэст супраць «паліцэйскай жорсткасці ў дачыненні да супрацоўнікаў СМІ», супраць таго, што сілы правапарадку «вырашылі не адрозніваць журналістаў ад маніфестантаў, замінаючы ім выконваць прафесійныя абавязкі».

«Гэта «савецкі» спосаб стрымаць крытычнае асвятленне падзеяў падчас перыядаў

напружання, — заявіла каардынатарка праграм Камітэта абароны журналістаў у Еўропе і Цэнтральнай Азіі Ніна Агнянава. — Мы заклікаем прэзідэнта Лукашэнку забяспечыць неадкладнае вызваленне ўсіх зняволеных рэпарцёраў, а таксама дазволіць ім працягнуць працу без пагрозы рэпрэсіяў».

Не засталіся абыякавымі да падзеяў у Мінску калегі з краінаў-суседзяў. Саюз журналістаў Расіі прыняў адмысловую заяву з нагоды ціску на калег у Беларусі і заклікаў усе СМІ выказаць салідарнасць з беларускімі журналістамі, падтрымаць іх у працы.

З патрабаваннем да беларускіх уладаў спыніць рэпрэсіі супраць працаўнікоў СМІ, якія выконваюць свае прафесійныя абавязкі, выступілі і ўкраінскі рух «Стоп цэнзуры!», і Саюз журналістаў Літвы, і Асацыяцыя польскіх журналістаў. Калегі з краін-суседзяў з уласнай гісторыі ведаюць, як небяспечна страціць свабоду слова.



Photo.bymedia.net

Саюз журналістаў Літвы ў адмысловай заяве нагадаў не толькі амбасадзе Беларусі ў Літве, але і дзяржаўным інстытуцыям сваёй краіны, што «свабода слова — гэта магчымасць вольна і без цэнзуры выказваць свае перакананні, погляды і думкі» і свабоду слова немагчыма аддзяліць ад сучаснага разумення дэмакратыі.

На падзеі ў Мінску адрэагавалі і журналісцкія арганізацыі з далёкага замежжа. «Нарвежскі саюз журналістаў ухваляе намаганні Беларускай асацыяцыі журналістаў па ўмацаванні прафесійнай і незалежнай журналістыкі ў Беларусі», — гаворыцца ў лісце, падпісаным прэзідэнтам Нарвежскага саюза журналістаў Элінам Флобергхагенам.

Асацыяцыя журналістаў Іерусаліма звярнулася да МЗС Ізраіля з просьбай запатрабаваць ад беларускіх уладаў вызвалення журналістаў і гарантавання свабоды слова і распаўсюду інфармацыі. Падобны зварот за подпісам старшыні асацыяцыі Дэні Закена быў накіраваны і ў амбасаду Беларусі ў Ізраілі.

З заклікам пісаць у амбасаду Беларусі лісты з патрабаваннем вызваліць палітычных зняволеных, сярод якіх ёсць журналісты, выступіла і грамадская арганізацыя «Сетка журналістаў у выгнанні», штаб-кватэра якой месціцца ў Лондане.

Між тым, міністр інфармацыі Беларусі абяцае супрацоўнікам незалежных СМІ жорсткія «разборкі». «Вялікая колькасць публікацый насіла адкрыта антыдзяржаўны характар, многія з іх утрымлівалі недакладныя звесткі, абразы і паклёп, заклікі да ўдзелу ў несанкцыянаваных мерапрыемствах», — заявіў міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі агенцтву «Інтэрфакс».

Праляскоўскі ўжо паабяцаў «пільна прааналізаваць дзейнасць гэтых СМІ» і «даць ім адпаведную прававую ацэнку». Разам з беларускімі будуць «прааналізаваныя» і некаторыя расійскія СМІ, прадстаўнікі якіх былі акрэдытаваныя на час выбарчай кампаніі ў Беларусі і асвятлялі падзеі з Мінска, на думку Праляскоўскага, «выключна перадузята і тэндэнцыйна».

*Падрыхтавала Яніна Мельнікава*

# «Было вельмі цяжка.
## Не ведаў, ці працаваць, ці шукаць маму і сястру па ізалятарах, ці бегчы з перадачамі. На ростанях быў…»

*Ала Ксёнжык*

Рэдактар аддзела палітыкі газеты «Наша Ніва» Зміцер Панкавец працаваў пасля 19 снежня, прысутнічаў на прэс-канферэнцыі Аляксандра Лукашэнкі, задаваў пытанне. А яго маці Ірына з сястрой Святланай былі затрыманыя на Плошчы і асуджаныя на 10 сутак.

***— Зміцер, як адбылося, што затрымалі тваіх родных?***

— Мая сястра вучыцца ў Гданьску на эколага. 18 снежня ў яе пачаліся канікулы, і яна прыехала ў Беларусь. Я сустрэў Свету, і мы разам адправіліся да мамы — у Барысаў. 19 снежня з раніцы ўсе разам мы прагаласавалі на выбарах, а вечарам паехалі ў Мінск. Я — да сябе дахаты, каб трохі адпачыць перад вячэрняй працай. Яны — да цёткі.

Сустрэліся мы ўжо ў калоне Віталя Рымашэўскага, якая накіроўвалася ад чыгуначнага вакзала да Кастрычніцкай плошчы. Потым доўгі час не бачыліся. Атрымаў SMS, калі пачаўся разгон на плошчы Незалежнасці: «Нас узялі».

Мы сазвоньваліся, але ж было ясна, што іх ніхто не выпусціць. Паведамілі, што, калі пачаўся разгон, яны пабаяліся ўцякаць, бо можна было разбіць галаву аб бардзюр — было слізка.

***— Якія атрымалі тэрміны?***

— Ведаеш, працэсы былі ў Маскоўскім судзе. Сястра віну не прызнала, сказала, што яе не адчувае. А мама — прызнала, што прымала ўдзел у несанкцыянаванай акцыі. Але ў выніку тэрмін атрымалі аднолькавы — па дзесяць сутак.

***— Звярнула ўвагу, што сам ты амаль нікому не казаў, дый не пісаў, што твае жанчыны ў ізалятары. Чаму не скарыстаўся службовымі магчымасцямі?***

— Калегі давалі інфармацыю, што яны затрыманыя. Але ж менавіта мне крычаць, што мае мама і сястра апынуліся ў гэтым спісе, калі ў ім было больш за 600 чалавек… Не, не думаю, што павінен быў узнімаць нейкі шум вакол іх дзвюх.

***— Многім калегам было цяжка працаваць у першыя дні пасля падзей 19–20 снежня. Быў стрэс. Як ты спраўляўся?***



*Зміцер Панкавец*

— Было вельмі цяжка. Не ведаў, ці працаваць, ці шукаць іх па ізалятарах, ці бегчы з перадачамі. Яшчэ нумар газеты здавалі. Трэба было і туды матэрыялы пісаць, і нешта рабіць для сайта. На ростанях быў…

***— На наступны дзень пасля выбараў ты яшчэ прысутнічаў на прэс-канферэнцыі Аляксандра Лукашэнкі і нават задаваў яму пытанне. Не было жадання пракрычаць пра затрыманне сваякоў?***

— Па шчырасці кажучы, былі думкі задаць пытанне: «За што пасадзілі маю маму і сястру?» Але ўсё ж такі вырашыў агучыць іншае — пра «падпал рэйхстага», палічыўшы, што гэтае пытанне будзе больш важнае за маё прыватнае.

Адразу пасля прэс-канферэнцыі паехаў у суд. І самае цікавае, што міліцыянты мяне ў памяшканне ўпусцілі (хаця нікога не прапускалі ўвогуле), таму што бачылі па тэлевізары на прэс-канферэнцыі. Але на сам суд я не патрапіў: працэсы ў судзе Маскоўскага раёна былі самыя закрытыя.

***— Зараз які настрой у тваіх блізкіх?***

— Маму звольнілі з працы. Яна была галоўным поварам у школе. Зараз мама шукае новае месца. Дзве спробы ўжо аказаліся марнымі. З ёю размаўляюць, а пасля гавораць: «Можаце да нас не прыязджаць, самі ведаеце, з якой прычыны». Мама пакуль не расчараваная, трымаецца. Так што нармальна ўсё.

…Зміцер, смеючыся, распавёў пра яшчэ адзін пераднавагодні момант. У канцы снежня яму давялося на некалькі дзён паехаць у Барысаў, каб, як гаспадару, калі ўжо яго сваякі сядзяць «на сутках», прыглядаць за коткамі. Але ж варта было яму вярнуцца ў Мінск, прыйсці на працу ў рэдакцыю, як увечары там адбыўсяператрус.

— Вельмі прыемна было, што ўвесь час, пакуль доўжыўсяператрус, на вуліцы, на марозе, стаялі і падтрымлівалі сваёй прысутнасцю неабыякавыя, у тым ліку калегі. Гэта вельмі дапамагала, дзякуй, — падсумаваў Зміцер.

Не люблю белорусские выборы.

Смотрю подконтрольные власти телеканалы (других в нашей стране нет) и содрогаюсь от приближения выборов последние лет пятнадцать. От того, что в первое послевыборное утро переживаю острое чувство беспомощности и полного унижения. А казалось, что счастье было близко…



*Виктория РАВИНСКАЯ*

# По эту сторону решетки — по одну сторону «баррикад»

Утро 20 декабря стало апогеем этих многолетних послевыборных рассветов. После бессонной ночи, около полудня, решила пройтись по улице. Зачем? Хотела посмотреть в лица победителей, которые голосовали за стабильность и дальнейшее процветание. То, что увидела, оптимизма не добавило, но хоть заставило улыбнуться. Растяжку «19 декабря — выборы президента Республики Беларусь» бравые парни из ЖКХ снимали и развешивали вместо нее «С Новым…». «Годом!» еще бултыхалось где-то на асфальте. И солидный мужчина за моей спиной возмутился, ни к кому не обращаясь: «Да с каким же новым?! Черт! Со старым!» Я готова была его расцеловать за искреннюю безысходность в голосе. И заулыбалась…

* * *

Случилось так, что уже на следующий день после черного понедельника пробрал меня какой-то несусветный грипп не грипп… Бешеная температура, которая в итоге вылилась во что-то буквально символическое. Я потеряла голос. Напрочь! Изъясняться могла только тихим шепотом. «Вот, — чуть не плакала я в кратковременных перерывах между приступами забытья, — и голоса у меня теперь нет. У меня какая-то тварь украла голос!»

В этом состоянии накануне Католического Рождества меня застал телефонный звонок Елены Автушко, которая все пятнадцать суток с первого дня массовых административных арестов металась в качестве водителя на своей машинке из Минска в Жодино и обратно едва ли не круглосуточно. «О-о-о-о! — расстроилась она, услышав мой надсадный шепот. — А я хотела тебя попросить…» «Проси, Леночка, проси!» — насиловала я свое голосовое шелестение. И поехали мы с ней собирать и возить передачи для почти трехсот жодинских сидельцев.

* * *

Не ждите от меня глубокомысленных выводов, символических параллелей. Я буду просто писать о том, что видела, слышала, чему удивлялась, о чем думала и что чувствовала, находясь «по эту сторону решетки» и по одну сторону послевыборных «баррикад».

Пятница, 24 декабря. Двор Жодинского ГОВД. В очередь записывают жодинские бабушки-пенсионерки. Они еще с 21-го дежурят каждый день возле милиции (о них расскажу немного позже). Кстати, на правах местной жительницы проинформирую несведущих. Раньше в здании, где теперь вполне вальяжно разместилась жодинская милиция (в Жодино, по последним статданным, проживает 62 228 человек), располагались четыре строительных управления — на каждое по этажу. Сейчас все этажи принадлежат только милиционерам. Но, видимо, найти место в просторных коридорах для «передачников» было невозможно. Или не хотелось.

Многочисленная очередь (мы были 36-ми, за нами еще колыхалась толпа) стоит на улице метров за сто — сто пятьдесят от здания. Не возмущаемся. Главная задача — передать все необходимое нашим сидельцам с Площади. «Утешьтесь, родные, — шутит какой-то острослов, вызывающе поглядывая на посиневших от холода жодинских милиционеров, «следящих за порядком». — Милиция с народом. Пусть померзнет!» Мы хихикаем. Странно! Но шутка действительно, как скупая капля «бальзама», орошает наши души…

Совсем некстати. Удивилась, когда увидела знакомое лицо исполкомовской дамы, пробирающейся к очереди. «Неужели у нее тоже кто-то сидит?» Даже из сочувствия поздоровалась, к ее нескрываемому ужасу. Оказалось, слишком хорошо о ней подумала. Дама была из




Фото Алеся Пилецкого

*В штаб-квартиру БНФ десятки людей приносили вещи для задержанных. Подобные «пункты сбора» работали в офисах других неправительственных организаций*

жодинского отдела идеологии. Видимо, наряду с милицией обеспечивала порядок. «Идиалагицки».

* * *

Бедные милиционерские юнцы! Мало того, что замерзли, так еще убедились в том, что «террористов» поддерживает такое количество людей с явным отпечатком интеллекта на лице. А что? Передачи ведь несут не какие-то насквозь пропитые ханыги, не марухи и прочий настораживающий контингент. Стоят, к примеру, интеллигентные пожилые папа с мамой. Мама «советуется» с друзьями по очереди: «Сыну в протоколе написали, что он выкрикивал антигосударственный лозунг «Жыве Беларусь!». Так что же, получается, что государственный лозунг — «НЕ жыве Беларусь!» или «Жыве НЕ Беларусь!»?»

Вообще, очередь у нас весьма живописная. Вот топает мокрыми ботиночками наш редактор Люда Отченашенко. Бледная, удрученная. «Вик, что будет?» — спрашивает как у пророка. Шепчу ей в ухо: «Иди погрейся!» Хрупкая Люда, может, впервые соглашается без пререканий, вздыхает и... остается мерзнуть. Лена Автушко в сотый раз спрашивает, правильно ли я заполнила заявление на передачу. Тут же ее дивный муж, координатор движения «За Свабоду» Саша Жучков, все проверяет. Правильно! Только бы пустили! Волнуемся! Заучиваем наизусть имена и фамилии наших «родственников»...

Я упомянула про потерю голоса вовсе не для того, чтобы кого-то разжалобить. Это мне здорово помогло. Был на приеме передач такой ЕДИНСТВЕННЫЙ мужчина. То есть все остальные были женщины. Когда я подошла к нему с двумя европейско-темно-синими клунками, он грозно спросил: «Кому?» И у меня мгновенно из головы выпало, кому. Начала что-то там шелестеть, мол, родственникам. И этот принимающий вдруг как-то сочувственно спросил: «У вас горло болит?»... Удивляюсь, что не расплакалась. Страшно подумать: неужели этот человек может по приказу взять в руки дубинку и раскроить мне голову? Ведь делали же это с такими, как я, «люди в черном», крошившие наших собратьев по перу и не только.

Об этом «приемщике» мы просто слагали «легенды». Надо сказать, передачи принимали четверо: три женщины («белобрысая», антибелоруска шатенка и «нормальная» левша) и этот самый чуткий мужичок лет сорока. Так вот, когда с мужичком начинали говорить по-белорусски, он на родную мову переходил легко и с видимым удовольствием. «Хоць родную мову з вамі прыгадаю!» — улыбался. Шатенка гыркала, если видела список передаваемых вещей на белорусском: «Я белорусского не знаю! Переводите!» Белобрысая орала на всех без разбору и без причин — мы были ей противны изначально и по определению. Левша с длиннющими наращенными ногтями просто автоматически принимала передачи и ни с кем в полемику не вступала. Зато не хамила и старалась втолкнуть в наши клунки побольше полезных вещей.

* * *

Напомню, мы приносили передачи в те дни, когда еще было совершенно неизвестно, что с задержанными кандидатами в президенты и живы ли они вообще... Короче, веселили мы друг друга не от радости, а чтобы не дать себе и другим сойти с ума от отчаяния. А отчаяние было. Вместе с ощущением, что все кончено. И было еще очень страшно за тех, кому мы передаем пакеты с самым необходимым. Утешали себя только тем, что вот ведь — собрали же эти передачи НАШИ ЛЮДИ! Значит, не одни мы в этой стране. Вернее, мы ТАКИЕ не одни.

* * *

Все-таки вернусь к нашему единственному мужчине-приемщику. Отмечу при этом, что после многочисленных

переносов тяжестей (каждый пакет весил два кило, а мы, хрупкие «нячэсныя» журналисточки, волокли их по четыре-пять в каждой руке) у меня на следующий же день открылся голос! Я смогла говорить с нашей «легендой»! И перлась в еще одну очередь со своей ношей уже именно к нему. Он вздыхал, краснел... и посылал меня к «нормальной леворучке», которая, по его подмигиванию, принимала у меня передачи просто влет!

А еще этот же человек вышел к очереди уже 27 декабря, чтобы произнести: «Извините, пожалуйста!» Очередь охнула. И он продолжил: «Мы до обеда не сможем всех принять — начальство приезжает. Зато после обеда все пойдет быстрее: жодинские говэдэшники помогут. Есть вопросы?» А как же! Могилевчанин привез своему сыну пайки на пятнадцать человек, «чтоб все в камере поели». «Пищевые продукты не принимаем, — стесняется легендарный приемщик. — Что вы волнуетесь? Мы им пищу из ресторана возим! А где еще вдруг на триста человек начнут готовить!» «Вы их хоть на улицу выводите?» — спрашивает мама молодого сидельца. «По первому требованию!» — без запинки отвечает «легендарный». И добавляет: «Вы книг столько не передавайте! Там же ж целая библиотека! Они даже прочитать все не успеют!» Вспомнилось, как несколько лет назад БАЖ собрала и передала в жодинскую тюрьму приличное количество книг для библиотеки. Тогда здесь «коротал время» правозащитник и журналист Валерий Щукин.

«А почему нельзя передавать больше одной передачи?!» — каверзничает кто-то. Не зря каверзничает, потому что все мы слышим собственными ушами изумительный по точности ответ: «Да поймите же вы! Это же не уголовники! Это же не АСОЦИАЛЬНЫЕ ЭЛЕМЕНТЫ! Они ж административщики. Это ж все равно, что на улице матом ругнуться!» И дивный контрвопрос очередников: «А многих ваша система сажает за мат на улице?» Приемщик окончательно смущается, машет рукой, но все же опять извиняется и уходит расстроенный.

А наши острословы начинают говорить друг другу: «Может, на «сутки» попроситься? А что? Из рестора кормят, гулять — по первому требованию, книг — море. Лежи, жри, читай и расслабляйся!»

* * *

Особо должна рассказать о безымянных (по понятным причинам) жодинских бабульках-пенсионерках. Они начали свое дежурство возле жодинской милиции еще 21 декабря. Дежурили самозабвенно, благо, имеют многолетний опыт.

Увидев, в каком подавленном состоянии стоят в очереди далеко не молодые чьи-то папа и мама из Минска, жодинская бабулечка тут же начала свою анекдотичную историю. «Это что! Вот в 2006-м, когда я узнала, что наших завезли в Жодино, собрала что могла. Нагрузила сумку на колесах, нацепила «парадную» шляпу и потянулась в СИЗО. Иду. Возле СИЗО никого нет. И вдруг, как черт из табакерки, — здоровенный сизошник в камуфляже. И говорит мне: куда, мол, бабка, столько передачи тянешь? А я ему гордо: «Дак ведь, сынок, у вас здесь Александр Григорич сидит. Несу вот жрачки, чтоб не помер!» Сизошника этого просто парализовало. А я ж еще и добила: «Ай, как стыдно! Здеся работаешь, а главной новости не знаешь!» И пошла. Долго потом слухи ходили, что возле Жодинского СИЗО ошивается сумасшедшая старуха, которая президенту каждый день передачи носит». Очередь умирает от смеха, молодые милиционеры не знают, как реагировать на «провокацию».

Эти бабушки ежедневно отслеживали по интернету, кому передачи дошли, а кто остался пока ни с чем. За каждого просили, «чтобы люди в обиде не остались». Вот вам и «пенсионерский лукашенковский электорат».

* * *

Позже выяснилось, что якобы именно наша БАЖевская группочка из пяти человек передала продукты «провокатору», бившему стекла в Доме правительства. А мы нисколько не жалеем. Пусть хоть на нарах в СИЗО он почувствует доброту «проигравших», тех, против кого «борется».

* * *

А потом мы пошли встречать... Дежурство возле закрытых ворот Жодинского СИЗО оказалось испытанием гораздо более изощренным, нежели таскание передач. Чего только ни придумывали «победители» в форме силовиков, чтобы лишить людей возможности проявить солидарность с осужденными!

Можно было приехать к полудню и ждать до темноты... выезда закрытых автобусов, безостановочно двигающихся до ближайшей станции метро уже в столице. Такое «счастье» испытали на себе Лена Автушко и Саша Зенков, продежурившие почти день возле зловещих ворот 29 декабря. А был же еще вечер накануне новогодней ночи!

* * *

Конечно, директивы есть наше изобретение (были и при Сталине, писались и для армии). Ну что тут поделаешь? Своеобразная традиция, не совпадающая с юридическими канонами. Раз в 2–3 года пишутся директивы, что-то «под них» делается, потом все забывается. Потом вспоминается. Когда реализация «циркуляров» корректируется и все идет по-другому.

Но внимание к нынешней директиве особое. За пару месяцев до ее подписания А. Лукашенко в своей программе дал новую парадигмальную установку: «От экономики директив — к экономике инициатив». Отличная мысль, кто же против. Плюс к этой позиции — курс на реализацию человеческого потенциала, поворот к «раскрепощению деловой инициативы и творческого потенциала граждан».

Мысли удивительные по своей актуальности. Конечно, следовало бы спросить, и конкретно: кто же так долго, лет 15, закрепощал потенциал «граждан»? Где эти полисимейкеры и аппаратчики? Почему мы не видим их всенародно?

Все это напоминает ситуацию с лекциями по истории КПСС. У нас в институте (Нархозе) доцент читал лекции за пару дней до отлучения от власти Н. С. Хрущева. Читал с упоенным восторгом, взахлеб, рассказывая о текущих успехах и начинающемся строительстве коммунизма. О мудром руководстве Хрущева нам сейчас многое известно, но тогда мы мало о чем догадывались. После восторженной лекции следующая была критическая. Все наоборот! Красноречие и дидактика работали с полным размахом. Камня на камне не оставил наш доцент от Никиты Сергеевича. «Оттягивался» по полной.

Сокурсники мои под впечатлением смеялись и шутили. Это была не лекция, а урок на всю жизнь: о лжи и слабости человеческой натуры. Урок ничтожности, подавленности и хамелеонства. Хотя доцент мог и не распаляться в своих выступлениях. Но мы ведь очень долго воспитывали в стране «дураков с инициативой».

Не хочется верить, но в начале 2011-го все повторяется. Те, кто был сторонником административной системы «управления» экономикой, стали вдруг

«рыночниками». Они с ловкостью комментируют диаметрально противоположные идеи — опять «на плаву» дети и внуки нашего доцента по истории КПСС.

А такими должны стать и министры, и губернаторы, и служащие правительственных структур. Или не станут? Будут говорить одно, а делать другое?

Скорее всего, так и будет. Ведь полтора десятилетия дискриминации, по существу социально выраженной, психологической, а также прессинг не могут вмиг смениться на благожелательность к предпринимателям, поддержку их инициатив. Принять экономическую свободу вместо административного управления чиновничий аппарат просто не сможет.

В этом перечне вопросов мы имеем, как говорится, «нечто». Свои доморощенные демократы и западные консультанты угодливо предлагают белорусам реформы и рынок. Под это давали деньги МВФ (3,6 млрд. долларов) и Всемирный Банк. Даже чиновники ЕС сподобились на обещания в 3 млрд. $. Для чего?

Для приватизации в пользу номенклатуры? Или реформ в пользу иностранных компаний? Защиты иностранных инвестиций?

А нужно ли нам это? Наделить министров и вертикаль очередными долями «фамильного серебра», дать поучаствовать в этом западным политкоммерсантам? Зачем, для чего одни проблемы системного плана заменять другими, не менее неприемлемыми.

Никакие выборы, директивы не заменят необходимость понимания изменений. Базовых изменений в белорусском обществе. В этом можно убедиться на примере экономических изменений (реформами называть «это» нет необходимости) в соседних странах. Особенно — в России. Там, вроде, рынок есть. Такой специфический. С коррупцией, криминалом. Но они «это» считают рынком. И сами себе не верят. Внутренне сопротивляются. Не хотят такой перспективы для собственных детей. Потому и отправляют их учиться за границу, а вскоре и сами уезжают.

Самоотрицание (при подобном развитии) грозит и нам. Половина нашей молодежи готова навсегда уехать из страны. Семьдесят процентов детей моих научных коллег и коллег по университету уже перебрались в США, страны ЕС. Папы получают ордена и медали из рук главы государства, а дети избавили себя от «Папиного» государства.

И кто же есть мы сами? Как и зачем добиваемся общих целей? Не подменяем ли принципы лучшего и свободного общества разными усредненными задачами и директивами?

Многие понимают это. Есть в директиве замечательные слова и положения о защите частной собственности. Защите от кого? От чего? От самих себя? Естественно.

Есть и другое, внешне привлекательное. Например, *«предоставить право преимущественного приобретения находящегося в государственной собственности имущества (кроме земельных участков) субъектам предпринимательской деятельности, арендующим данное имущество не менее трех лет, с рассрочкой платежа на пять лет»*. Это означает, что, если вы взяли в аренду этаж для офиса в муниципальном строении, у вас есть право на покупку этого этажа.

Ну и что? Купите с радостью? Вот так просто мэр поселка, города вам и отдаст то, что на время позволил использовать! Не спешите. Сначала постарайтесь понять, что речь идет только о «преимущественном приобретении». Перед тем, кто будет вашим конкурентом. А цена? Выстроится ряд приобретателей — и своих, и чужих. Ценами вас просто смоет, как волной.

Более того, у чиновников есть и супераргумент — «кроме земельных участков». Это имело место во многих странах Восточной Европы. Здания покупали, а земля — в собственности других. И — вперед, катитесь, куда хотите, с этой земли.

Рассуждать можно о многом. Например, ждать исполнения желаний и чудесного превращения «белорусского экономического чуда» в чудо рыночное. Почему бы и нет? Начинающейся номенклатурной приватизации жизненно необходима минимальная либерализация. Ею можно и закрепить переход, то есть конвертацию политической власти во власть экономическую. Процесс идет явно, но, по большому счету, скрытно. Под него и прошла директива. Под эту конвертацию власти заточены слова и дела победивших на недавних выборах стратегов неономенклатуры.

Надо радоваться? Кто-то вправе это делать. Те, кто должен разделить собственность и власть в 2011 и последующих годах. «Маленькие радости» получат и предприниматели. «Непременно, батенька, получат», — как сказал бы в такой ситуации известный политический лидер всех времен и народов.

А что свободная экономика? Рыночная экономика свободных людей? А это и есть реальная цель преобразований в Беларуси. В развитии не экономики директив, а экономики инициатив.

Именно в этом тезисе пока сомневаться не приходится. Осталось объединить усилия. Причем не только теоретические, умственные. Но и практические, деловые и прагматические

*Юзік ЛАБЭЦКІ*

# Вір

## Сацыяльна-эканамічны агляд і сярэднетэрміновы прагноз

**Як я быў яшчэ малы, вада ў рацэ нашай была чыстая-чыстая, можна было піць яе. І вялікія рыбы плавалі ў цені дрэваў. А ля вострава быў вір. Кінеш трэсачку якую, і яе там пачынае круціць. Усё меншыя кольцы, усё хутчэй круціцца, аж пакуль не знікне.**
**Зараз у нас, у нашым краі, такі вір зрабіўся. Круцімся без толку.**

Іншы раз напалохаюць людзей чым, дык яны пытацца пачынаюць: «Скажы, Юзік, што было, што будзе, чым душа супакоіцца?»

Было... А што было? Заўсёды тое самае і было. Наталіўшы смагу і голад, жанчыны шукалі сабе мужчынаў, каб нарадзіць дзяцей. Дзеці нараджаліся, плакалі і кожны дзень прасілі есці. Так было, гэтак ёсць, і гэнак будзе. Дзеля таго мусім штодня працаваць і змагацца з лёсам.

Яшчэ жанчыны вучаць дзяцей размаўляць. Ці не так? Цягаюць іх на руках, потым водзяць за руку і нешта гавораць, гавораць увесь час. Глядзі, гэта тое, а гэта не тое. Ты хлопчык, а ты дзяўчынка. Гэта добра, а гэтак рабіць не варта.

Першыя тры гады свайго жыцця большыня з нас амаль цалкам залежала ад жанчын.

І калі падзяліць свет гэты на дзве часткі: рэчы і дух, — то дух, які ні ёсць, уваходзіць у чалавечкаў малых з вуснаў жанок.

Некаторым з дзяцей і ў нашыя часы шанцуе, што апрэч нармальнай маці ў іх ёсць нармальны бацька. Ён вялікі, дужы і справядлівы. Ён вырашае і судзіць, ён шкадуе і падымае пад самае неба. Ён уладарыць над светам рэчаў. І Ён закаханы.

Пасля трох гадоў, калі мае сына гэткі бацька, то ўводзіць хлопчыка ў вялікі свет рэчаў... Стоп!

«Што ты вярзеш, дзед? — нехта скажа. — Твая казачка састарэла».

Не, дакладней, не зусім яна састарэлая. Проста склалася так, што цэлыя апошнія сто гадоў падзеі былі для беларусаў неспрыяльныя і многа, занадта многа дужых, прыгожых і разумных мужчынаў загінула. Да таго ж войны, калгасы, турмы моцна прайшліся па ўсім, што было створана нашым людам, — і засталіся толькі вартыя жалю парэшткі. На тых парэштках ацалелыя целяпаюцца, робяць што могуць ды як умеюць.

Адробяць. Балазе, рукі куды трэба прыстаўленыя. Хіба з моваю турботы будуць. Бо ўжо з паўсотні гадоў як большыня тутэйшых дзяцей чуе ад мацярок расейшчыну. Не кажу — расейскую. Бо як у Расеі на чыгунцы працаваў, то сапраўдную іхную гаворку чуў. І кніжку іншы раз пачытаю. Дык вось, у тутэйшай расейшчыне словаў мо ўтрая меней, плоская яна нейкая, нібыта з інструкцыі па грамадзянскай абароне.

Рускія школы, польскія школы — тае бяды. Перажылі тое лёгка, але ж тут яшчэ тэлевізар. Я зараз жанок, у якіх глузды тым тэлевізарам не пашкоджаныя, і не ведаю. Бо па сабе скажу: адзіны спосаб ёсць з тэлевізарам змагацца — наогул не глядзець. Пятнасце год ужо не зазіраю ў тое чортава акенца, крыху ачуняў.

Дык вось, за мноства грахоў нашых насланы на баб тэлевізар, а на мужчынаў — гарэлка. Таму малыя няшчасныя толькі і чуюць, што рэкляму, а як татка прыйдзе з душою адпітай, хворы, злосны, ды жонку біць пачне, чуюць лямант ды брыдкаслоўе. І гэтак праз тры хаты на чацвёртую. Ніякай табе акупацыі не трэба. Не дзеці робяцца, а нейкія хамячкі: соваюцца туды-сюды бязглузда ды гэтыя чыпсы жаруць. Ані гульняў людскіх не ведаюць, ані рабіць нічога не ўмеюць.

За тым усім лепшае ад дзядоў добра калі да кожнага дзясятага дзіцяці даходзіць. Няма рэчышчаў даўнейшых дзеля досведу. Бачу зараз, як цяжка сапраўдным майстрам, у чым заўгодна людзям спрактыкаваным. Вучняў майстру ўсё цяжэй адшукаць!

Адныя гэтыя няшчасныя кабеты без мужоў, штурхаюць дзетак, крычаць на іх. Не дзіва, палічылі ўжо, што тры чвэрці шлюбаў скасоўваецца ды кожнае пятае дзіцё па-за шлюбам родзяць.

А чаму гэткая мода пайшла, той казаў: шлюб пад плотам, а вяселле потым. Гамоняць: разбэсцілі народ living розны... 

Але не ад місы смак залежыць. Проста тыя вострыя прысмакі з сытай Амерыкі альбо Еўропы праз рускае сіта да нас прапіхваюць. І гэтае абы-што тут потым трушчаць не як ласунак, а як хлеб. Завялася ў бедакоў лішняя капейчына — і




Photo.bymedia.net

тую пруць на атруту: наркотыкі ды розную парнаграфію.

І яшчэ. Даўней з тых, што пазычалі, смяяліся. А зараз крэдыт той хопнуць — справа гонару. Ужо на шаснаццаць трыльёнаў рублёў пазык людзі набралі. Чым думаюць? Начальства ўсё за мяжой пазычае, а галота следам за начальствам...

Дайце нам, як панам, чаю з агуркамі! Усе сметнікі ў немцаў падчысцілі. Машыны яны, бач, купляюць. Потым, хто з Менска, зірніце ў акно: стаіць тое ламачча снегам засыпанае. Будуць «на дачу» ездзіць. З тае дачы толку, як з казла малака. Кітайская гароднiна-садавіна ўжо таннейшая за нашу, і гішпанская, і бельгійская... Ды з усяго свету. Сам бачыў.

І што з таго будзе? Мяркую так. Няхай сабе штогод нараджаецца прыкладна сто тысячаў дзяцей. Гэта значыць, што тут ужо жыве два мільёны беларусаў, маладзейшых за 20 гадоў, якія не бачылі іншага жыцця. Якія не ведаюць ніякага іншага ладу, іншай мовы, іншай улады.

Казалі па нямецкім радыё, што зараз чвэрць мільёна наркаманаў — будзе праз дваццаць год паўмільёна. Я рознае радыё слухаю: і Маскву, і Ватыкан, і Варшаву. Ды свае вочы ў лобе маю.

Не менш у нас як паўтара мільёна алкаголікаў. Два мільёны чалавек хоць тыдзень, а за кратамі пабывалі. А гэна, суседаў сын гаворыць: «Хто не быў, тот будзет, хто был — не забудзет». Вядома, што пасля турмы нашай, дый пасля войска ў хлапцоў уся псіхіка перакрыўленая. Што не меней за паўгода п’юць, як перад канцом свету, як адтуль вырвуцца. Супакоіцца не могуць. І пітушчых праз дваццаць гадоў удвая паболее, калі не апрытомнеем.

Восем мільёнаў нас тут беларусаў. І чым далей, тым болей адно аднаго дурнямі лічым. Гэта ўсё мы — Божа! Ды не дадзена нам іншай зямлі і будучыні, чым тыя, што ёсць і будуць намі самімі зробленыя.

Што будзе? Тое будзе, што нас не будзе, па звычцы адказваю. Ніякавееце, а дарма. Бо не ведаеце, як гэна — глядзець на непазбежнае як на той бераг ракі.

Можна імкнуцца насуперак плыні, можна рвацца штохутчэй, а можна проста плыць, сілы ашчаджаць. Усё можна, калі ты сам сабе гаспадар, сабе аднаму належыш, сабою кіруеш, сабою валодаеш.

А хто ты такі? Зрэшты, сваю няпэўнасць кожны адчувае, ды не кожны хоча прызнавацца. Ведае, якім ён хоча быць. Ведае, што дзеля гэнага трэба зрабіць. Ведае, як гэта трэба рабіць. Але не здольны перамагчы ў сабе нешта... Потым сорамна, як зробіць такое, што і ўспамінаць гідка.

Вялікім кожнаму хочацца здавацца. Салідна выглядаць. Толькі, на дыбках стоячы, вышэй не зробішся, дый на пяты мусіш неўзабаве апусціцца. Усім будзе смешна, хто заўважыць. А табе крыўдна.

Веру ў Бога. Таму не баюся будучыні. Дый мая будучыня тут хутка зробіцца. А ў маладых на шляху да таго, кім хочуць быць, — тры перашкоды, як тры сцяны паміж імі ды іхнымі марамі. Адна — тое ў табе, што замінае быць добрым. Другая — лёс. Трэцяя — іншыя людзі.

Будзеш моцны — сабе рады дасі, адолееш д’ябла. Будзеш цярплівы — беды пераж ывеш, за лёсам пойдзеш і шчасце знойдзеш.

Людзі... Кожны за сваім ідзе, а сцежкі робяцца. Бо многа каму адное і тое трэба. Думай...

# Каму ў Беларусі жыць добра



## Наша дзяржава арыентаваная на чыноўнікаў — ад самага галоўнага да апошняга клерка ў кіраўнічай канторы.

*Міхась ЗАЛЕСКІ*

Сістэма сацыяльнай абароны ў поўным аб'ёме захавалася ў нас з часоў СССР, аднак яе эфектыўнасць радыкальна знізілася. Бо сацыяльныя праграмы падтрымліваюць нябедных болей, чым жабракоў.

Вось прыклад-ілюстрацыя. У табліцы паказана, колькі тысяч афіцыйна бедных і колькі тысяч афіцыйна заможных сем'яў атрымліваюць розныя сацыяльныя льготы. Усе хатнія гаспадаркі краіны падзеленыя ў табліцы на 10 роўных груп (статыстыкі іх называюць дэцыльнымі групамі) па ўзроўні прыбыткаў на аднаго сямейніка. Група 1 мае самы нізкі прыбытак, група 10 — самы высокі. Бадай, толькі самую заможную групу варта параўноўваць з еўрапейцамі.

Там, дзе «ўладары свету» не цягнуць з дзяржаўнай кішэні, усё выглядае натуральна: дзве трацiны або палова дапамогі на харчаванне і на дзетак дастаецца незаможным.

А там, дзе капіталізму яшчэ няма, але патрабуецца пэўная якасць паслугаў, пануе савецкая сістэма доступу да лепшага па ніжэйшых коштах. І, натуральна, большая палова дапамогі размяркоўваецца «лепшым сынам і дачкам», якія...

Вынікі, атрыманыя беларускімі даследчыкамі шляхам спецыяльнага вывучэння праблем адраснай сацыяльнай дапамогі, не асабліва і вядомыя. Дый навошта...

Наіўныя даследчыкі мяркуюць, што падстава для «няадраснага» выкарыстання сродкаў — «адсутнасць неабходнага ўліку ўзроўню даходаў пры размеркаванні дзяржаўнай дапамогі паміж сем'ямі з розным узроўнем даходаў».

Насамрэч грошыкі ідуць тым, хто набліжаны да выціскання з краіны максімальных дывідэндаў.

## Як мы робім і што маем

Уявіце сабе маладых, што, узяўшы шлюб, аддзяліліся ад бацькоў. І кажа гаспадар: «Жонка, мы людзі сумленныя, працуем шэсць дзён на тыдні, а ў нядзелю прыстойна адпачываем. Трэба нам дзеля працы лепей харчавацца, а дзеля адпачынку годна выглядаць. Зноў жа, неўзабаве будзе нам прыбаўленне. Мусім паклапаціцца і аб малым!» Пастанаўляюць яны так: зарабляем мы два мільёны штомесяц (някепска, бач, жывуць), а каб гэтак было, як хочацца, трэба мець тры. То станем пазычаць: спачатку — у бацькоў, потым — у братоў, потым — у суседзяў, потым — у банках розных, і, нарэшце, калі ўсе прычэпяцца: «Аддай-аддай»...

Тут мне фантазіі не хапае. А вам, шаноўныя чытачы, ці не падаецца гэткая сям'я поўным зборам дурняў? Напэўна.

***Колькасць хатніх гаспадарак, што атрымліваюць сацыяльныя льготы, па дэцыльных групах (тысяч гаспадарак)***

| Групы | Харчаванне | На дзяцей | Усяго па слупках 1 і 2 | | ЖКГ | Пуцёўкі | Лекі | Іншыя | Усяго па слупках 5, 6, 7, 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | |
| 1 | 60 | 90 | | | 42 | 15 | 55 | 3 | |
| 2 | 48 | 46 | | | 47 | 24 | 62 | 4 | |
| 3 | 47 | 41 | | | 43 | 29 | 65 | 8 | |
| 4 | 56 | 30 | | | 53 | 33 | 57 | 5 | |
| 5 | 39 | 27 | | | 53 | 30 | 79 | 6 | |
| Па пяці бедных групах | 250 | 234 | 484 | Па трох найбяднейшых групах | 132 | 68 | 182 | 15 | 397 |
| 6 | 39 | 23 | | | 40 | 35 | 73 | 4 | |
| 7 | 43 | 23 | | | 43 | 35 | 65 | 4 | |
| 8 | 42 | 14 | | | 55 | 39 | 57 | 9 | |
| 9 | 29 | 10 | | | 43 | 44 | 63 | 4 | |
| 10 | 26 | 5 | | | 35 | 35 | 48 | 4 | |
| Па пяці багатых групах | 179 | 75 | 254 | Па трох найбагацейшых групах | 133 | 118 | 168 | 17 | 436 |

Беларусь аддзялілася ад СССР, лічы, у 1991 годзе. Багата чаго за той час змянілася. І на статыстыку шмат хто наракае. Але ж той вызначаны статыстыкамі валавы ўнутраны прадукт, ростам якога хваліцца ўвесь час начальства, і намінальны заробак падлічваліся тымі самымі спецамі ў аднолькавых на год разліку рублях. І атрымалася...

***Выраблена ВУП адным занятым у эканоміцы на адзін налічаны рубель заработнай платы***




Ці то працуем мы за часы Лукашэнкі што далей, то меней; ці то атрымліваем за сваю мізэрную працу ўсё болей? А можа, на карку нацыі ўжо цесна ад «слугаў народа», што гоняць люд невядома куды? Апошняе, як на маю думку, найбольш падобнае да праўды.

Бо чым ёсць валавы ўнутраны прадукт у самым простым разуменні — сумаю дададзеных вартасцяў. Што за яны? Ну, напрыклад, я купіў бервяно, і сусед купіў. Ён распілаваў упоперак і атрымаў дровы, а я — удаўжыню і атрымаў дошкі. Ён прадаў, і я прадаў. Хто болей атрымаў? Той, хто больш кваліфікаванай працы выкарыстаў, дадаў вартасці. Каб я мэблю зрабіў, то было б яшчэ лепей.

Тыя, што пасвяць працоўных, могуць таксама вартасці дадаць тавару, калі прыстрояць яго выгаднаму пакупніку альбо так работу арганізуюць, што ўсім прыемна. Так усё зробяць, каб нам выгадна было працаваць. А яны во што зрабілі, глядзіце.

Каб вырабляць свае тавары, прадпрыемствы нашыя, за другімі саветамі пабудаваныя, — вельмі вялікія і абавязаныя экспартаваць — патрабуюць імпарту сыравіны і камплектацыі.

Заўважце, з кожным годам розніца ў цане імпарту і экспарту павялічваецца не на нашу карысць. Змяніць сітуацыю не можа ні рабочы, ні настаўнік, усё вырашае арганізацыя.

Прыкладам, ёсць тры беларусы-станочнікі: у Барысаве, Беластоку і Чыкага. Дык наш робіць экспартнай прадукцыі на 1300 даляраў, польскі супляменнік — на 3000, а амерыканскі — на 13000. Рукі ва ўсіх аднолькавыя. Камандзіры — розныя.

Ну, здавалася б, усё відавочна: прадукцыйнасць працы падае 15 гадоў, знешні гандаль не дае чаканага эфекту 15 гадоў, а камандаваць хочацца... Дзеля гэтага трэба, каб масы людзей не адчувалі бесталковасці сваёй працы і безвыніковасці калектыўных намаганняў, каб куплялі, куплялі і куплялі новыя кватэры, машыны, вопратку, ежу... Куплялі, не зарабіўшы. Куплялі і хвалілі начальства: «Жить стало лучше, жить стало веселей!» Знойдзены быў спосаб просты і хуткі: рост усіх магчымых тыпаў запазычанасцяў.

Некаторыя крэдытаў панабіралі, а зараз аддаць не ў стане — але гэта іхныя праблемы, тут кожны за сябе адказвае. А за тое, што набралі дзяржава, банкі і прадпрыемствы ад нашага імя, давядзецца адказваць усім нам...

***Абсалютныя паказчыкі валавай знешняй запазычанасці Беларусі, млн дал. ЗША***

| | 01.01.2007 | 01.01.2008 | 01.01.2009 | 01.01.2010 | 01.04.2010 |
|---|---|---|---|---|---|
| **Валавая знешняя запазычанасць па ўсіх сектарах эканомікі** | 6844.1 | 12496.5 | 15154.1 | 22060.3 | 22243.5 |
| **Абслугоўванне знешняй запазычанасці** | 3680.9 | 3965.4 | 6448.5 | 5822.2 | 1730.3 |

Крыніца: Нацыянальны банк http://www.nbrb.by/bel/statistics/ExternalDebt/Parameters/

Чаму кажу пра банкі і прадпрыемствы? Ну мы ж не дзеці, ведаем, што тут без дазволу зверху скочка не скоча, а яны мільярды даляраў «самі» напазычалі.

Выглядае гэта наступным чынам.

За тры гады канчатковага пагаршэння знешняга гандлю знешняя запазычанасць вырасла ўтрая. Мільярды ідуць ужо на абслугоўванне тых пазыкаў. Кожны жыхар краю, нават немаўля ў люльцы і дзед, што здзяцініўся, павінны па 2500 даляраў, а камандзіры хваляцца: еўрабонды прадалі.

А тое, што да 2015 года за гэтыя 600 мільёнаў даляраў давядзецца больш за мільярд аддаць, іх не хвалюе — відаць, маюць фантазію, багацейшую за нашу.

***Адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі, млн дал. ЗША***



# О свинье в год кролика



*Константин*
***СКУРАТОВИЧ***

**Когда газеты, некогда травившие «попов и поповщину», публикуют рождественские послания духовных пастырей, удивляться ничему не приходится.
Трудно понять, где религия, где ересь, где милая, но чужая традиция, призванная укреплять пошатнувшуюся в заблудших душах веру в «доброго царя». Народу хочется чуда, и его обещает Белый Кролик, под патронажем которого пройдет наступивший год.**



Вообще, кролики, в отличие, скажем, от козлов, не являются традиционными для наших широт животными. Им требуется климат помягче, а хозяйского внимания побольше. Где-нибудь в Австралии демонстрирующие своей плодовитостью искреннее стремление уничтожить растительный покров континента кролики могут считаться сорными животными. В Европе таких предпосылок не имеется, поэтому бюргеры вполне с ними уживаются. Прыгают себе лопоухие по парковым лужайкам, глаз радуется.

В наших условиях кролик может существовать как животное исключительно домашнее. Во-первых, по причине переизбытка бесхозных собак в каждом населенном пункте, во-вторых, из-за преобладания в социуме всегда обеспокоенного пропитанием населения, в-третьих, ввиду регулярно наступающей зимы. Если от холодов кролика вполне мог бы спасти мех, то от голодной гибели — пуля охотника или клыки волка.

К слову, советский человек был не менее сентиментальным, чем нынешний. Бывало, украдет колхозного поросенка, сменяет на самогон, пьет и плачет, что продовольственная программа слабо исполняется. Вот если бы кроликов завести, то их резать не перерезать...

Отметим, что в продолжение всей советской истории партия учила работать на конечный результат. А тут случай такой: запустил кроля в клетку — жди приплода и точи нож. Чудо? Чудо, которым Отечество победившего пролетариата собиралось поразить весь мир. Даже коэффициенты придумали, в соответствии с которыми крольчатину собирались переводить в свинину, а шкурку кролика — приплюсовать ко всем остальным мехам. Получалось, народ ходит сплошь в меховых шапках, чиновники тоже. Равенство есть, нищеты — нет.

Как у Зощенко: «Кролики — это не только ценный мех, но и три-четыре килограмма легкоусвояемого мяса». Но ведь завезли кроликов, разверстали по учреждениям, выделили кормов до 30-го, а с 1-го они уже должны питаться по учреждениям, но не берут, хоть на календаре 5-е. Чудо, что еще живут.

Бывало и хуже. Любопытные сведения на сей счет имеются у нашего земляка Ивана Солоневича в его книге «Россия в концлагере». Это первое и энергичное свидетельство сидельца ГУЛАГа, поражающее свежестью изображения и глубиной анализа нового социального материала. Сегодня читается как один большой и веселый анекдот о путях созидания нового при тотальном отрицании старого. К слову, анекдот злободневный, в котором начало имеет множество точек соприкосновения с фантасмагорическим завершением проекта. Подставляй только в отдельных местах слова типа «демократизация», «либерализация» — не всякий догадается, что написано восемь десятилетий тому назад. Например, сюжет, изображающий заседание гулаговского начальства по поводу оптимальной утилизации отработанного человеческого материала, трудно отличить от селекторного совещания с его необходимым уклоном в сторону кадрового вопроса.

Задачи, иронизирует Солоневич, решаются по мере их поступления, инициативы и почины непрерывным потоком поступают с мест. Ранний, сверхранний и зимний сев, устройство бытовых коммун (кондоминиумов), борьба с религией (с чуждой идеологией) и прочие штучки, включая полную знаковую и содержательную эквивалентность прежнего и нынешнего понятий «враг народа».

Вчера — уничтожим последнего попа, примемся за кулака, после за уклониста. Сегодня — последнего коррупционера, оппозиционера, отморозка. Вчера и сегодня — смертельный бой бюрократии.

Однако вряд ли у автора получится лучше, чем у Солоневича: «Когда в подмогу к остальным двуногим и четвероногим, впряженным в колесницу социализма, был запряжен этаким коренником еще и кролик, это было глупо. Так сказать, в принципе. Кролик — зверь в нашем климате капризный, кормить его все равно было нечем, проще было вернуться к знакомым населению и притерпевшимся

ко всем невзгодам русской жизни свинье и курице. Но все-таки кое-чего можно было добиться и от кролика, если бы не энтузиазм.

Десятки тысяч активистов уцепились в куцый кроличий хвост, надеясь, что этот хвост вытянет их куда-то повыше. За границей были куплены миллионы кроликов за деньги, полученные за счет вымирания от бескормицы свиней и кур. В Москве, где не то что кроликов, но и людей кормить было нечем, «кролиководство» навязывали больницам и машинисткам, трестам и домашним хозяйкам, бухгалтерам и даже — страшно сказать — церковным приходам! Отказываться, конечно, было нельзя — «неверие», «подрыв», «саботаж советских мероприятий». Кроликов порасписали по московским квартирным дырам, и кролики передохли все. То же было и в провинции».

В общем, нет таких крепостей, которые не могли бы взять большевики. Причем с блеском, как теперь сказали бы, элегантно. В Подмосковье был создан кролиководческий колхоз, привилегированный по части кормов. Кролики толстели, но «пребывали в аскетизме» и размножаться не хотели. Как выяснилось, на семь тысяч импортных бельгийских кроликов самок было только около двадцати.

Как и теперь, в то время кадры решали все. Но имя того, кто согрешил против естества, устроив для кроликов мужской монастырь, осталось неизвестным.

Суда не было, значит, не было преступления и преступников. Кроликов же зарезали и съели, поскольку лимиты на год оказались исчерпанными. А без пищи кролик долго не живет.

Это был момент истины. Казалось бы, однажды потерпев жесткое фиаско, начальство впредь не будет вкладывать средства в обещающий чудеса энтузиазм трудящихся. Но кроликами только начиналось. Впереди были коллективизация, индустриализация, электрификация, химизация, борьба против травополья, мелиорация, кукуруза и безотвальная пахота.

Нынче вроде бы обратились к здравому смыслу и опыту предков. Решили возвратить свинье то место, которое она прежде занимала в обществе. Но после слов о том, что белорусские свинарники должны быть лучше европейских, свиньи перестали смотреть на людей как на существ себе равных. Современное жилище — это не только очаг и кров, но и свидетельство социального статуса. А у основной массы наших людей жилища куда хуже европейских.

Вознесли свинью на пьедестал, ходят вокруг, задрав голову. Кто виноват? Не кролики, понятно, не свиньи. Видимо, всему виной то самое нечто внутри, что заставляет нас выбирать такие вот маршруты.

Это абсолютно достоверный диагноз очень серьезной болезни. Но слабый шанс на выздоровление еще остается. До той поры, пока мы свинье не позавидуем.

# Як Бог стварaў беларуса



*Алесь АНЦІПЕНКА*

**Некалі Ўладзімер Караткевіч распавёў легенду пра тое, як Бог, стварыўшы сьвет, надзяліў розныя народы зямлёй, а на беларусаў забыўся.**

**Не хачу паставіць пад сумнеў праўдзівасьць той гісторыі. Але ж яна нічога ня кажа пра тое, як Бог стварaў саміх беларусаў. На шчасьце, пра гэта ёсьць другая легенда.**

Напачатку ўсё было так, як кажа Біблія: «...стварыў Бог неба і зямлю... І ўбачыў Бог, што гэта добра». А далей вырашыў Гасподзь стварыць ня толькі чалавека, але і розныя народы. Першымі стварыў, натуральна, гэбраяў. Бо цікава было Яму паразмаўляць з разумнымі людзьмі. А самае галоўнае — разьлічваў Ён паслаць у гэты народ Сына свайго адзінароднага.

Другімі выштукаваў грэкаў. Бо ведаў, што тыя закладуць падмуркі эўрапейскай цывілізацыі, шмат чаго дзіўнага ды прыгожага зробяць ды на новыя шляхі ўсё чалавецтва выведуць. Потым былі італьянцы, французы, немцы... Карацей, сфастрыгаваў амаль усе народы.

Дайшла чарга й да беларусаў. Паглядзеў Бог у будучыню і ўбачыў, якая гаротная доля тых чакае. Будзе беларускі мужык «дурны, як варона», будзе «цёмны, сьляпы, быццам крот» (так напішуць іхныя паэты Францішак Багушэвіч і Максім Багдановіч), будзе жыць без сваіх элітаў (як пазьней сьцьвердзіць Валянцін Акудовіч), матчынай мовы адрачэцца, а на «Жигули» будзе казаць: «Автомобиль отечественного производства».

І моцна задумаўся Бог: а ці варта ствараць такі нягеглы народ? І вырашыў не ствараць.

Але, як толькі вырашыў так, сталася Яму неяк няўтульна: дужа ж супярэчлівая сытуацыя атрымоўваецца. Па-першае, ці будзе тое справядліва, калі пашкадаваць беларусаў болей за астатніх? А па-другое, як тое мажліва, каб дасканалы Творца ня мог выштукаваць адпаведны прадукт? Ці ж ня ўсёмагутны Ён?!

І тады заманіфэставаў Бог напоўніцу ўсе свае Веліч, Красу і Сілу. Дый стварыў беларуса!

# Пяць навагодніх гісторый



*Сямён ПЕЧАНКО*

## Прысвячаецца ўсім тым, хто з незалежных ад іх прычынаў адзначаў Новы 2011 год не ў коле сям'і.

**Новы год для мяне — асаблівае свята. І асабістае — ёсць у ім адзін значны момант: у навагоднюю ноч я раблюся на цэлы год старэйшым, бо нарадзіўся акурат у апошнія хвіліны снежня. Пашпарт такую дробязь не ўлічыў, таму ў ім пазначана 1 студзеня. Я не крыўдую. Падвойнае свята мае свае перавагі: падарункі дорацца ў падвойным памеры (прынамсі ў дзяцінстве гэта спрацоўвала). Акрамя таго, я быў не адзіным навагоднім падарункам для маёй сям'і — у тую зімовую ноч нарадзіўся і мой брат-блізнюк Паўлюк. Вось так.**

Новы год — яшчэ і нагода пакорпацца ў асабістым: што змянілася за год, што зроблена, а што адкладзена да лепшых часоў. А то і проста прыгадаць мінулае, у тым ліку і папярэднія святкаванні. Пастунова ў мяне выбудаваўся своеасаблівы рэйтынг, з першай пяцёркай якога я і наважыўся вас пазнаёміць, аформіўшы гэта ў навагоднія карацелькі.

### I. Дзед Мароз і аўтамат Калашнікава

Гэта здарылася ў другой палове 80-х. Бацька пасадзіў мяне з братам побач ды сур'ёзна запытаўся, што замовіць для нас у Дзеда Мароза. Што маглі папрасіць у дзядулі выхаваныя на гісторыях пра добрага Уладзіміра Ільіча хлапчукі? Пра той час у мяне захавалася не так і шмат успамінаў. Памятаю, як старэйшы брат перамог у конкурсе навагодніх касцюмаў, апрануўшыся... праваслаўным бацюшкам. Цяпер гэта гучыць як блюзнерства, а тады такі ўбор быў нічым не горшы за апранахі пірата. Тады мы марылі пайсці ў школу, каб добра вучыцца, дапамагаць калгасу ўбіраць ураджай і ўзяць шэфства над суседам-ветэранам. Так, мы былі маленькімі савецкімі хлапчукамі, таму доўга не думалі: папрасілі ў Дзеда Мароза цацачныя аўтаматы. Ну, такія, падобныя да сапраўдных. І Стары не падмануў! На раніцу на нашых ложках, у нагах, нас чакалі пакункі з цацачнымі аўтаматамі Калашнікава. Яны стракацелі кароткімі чэргамі, міргаючы чырвонымі лямпачкамі на дзюбцы рулі. Тут жа разгарэлася невялікая «братазабойчая» вайна, якая невядома чым магла скончыцца, калі б старэйшыя браты не выступілі ў ролі міратворчых сілаў.

Дзякуючы такому падарунку мая вера ў Дзеда Мароза стала амаль абсалютнай. Ён і раней радаваў нас сюрпрызамі, але тая гісторыя ўзнесла маю веру ў навагодняга чараўніка на самы пік.

Пазней, калі мы пайшлі ў школу, а праз колькі год памерла бабуля, і я даведаўся, што такое рак, навагодні міф быў развянчаны. Але я захоўваю самыя цёплыя ўспаміны пра тыя часы. Многія з маіх родных былі жывыя і здаровыя, мы збіраліся вялікімі сем'ямі на шумныя і вясёлыя святкаванні. І, здаецца, ніякае ідэалагічнае шалупінне позняга саўка не магло сапсаваць нам свята.

### II. Новы год у Ялце

Напрыканцы 1993-га ў нашу школу даслалі два дзясяткі пуцёвак у беларускі санаторый у Крыме. Сярод шчаслівчыкаў былі і мы з братам.

Тагачасная Ялта была для нас сапраўдным раем. І не толькі дзякуючы мору ды пальмам. У нашых крамах у той час было пуста, а тут ужо працавалі прыватнікі, якія гандлявалі «пластмасавымі» турэцкімі шакаладкамі ды заморскім шырспажывам.

Праўда, месцічы не маглі пахваліцца высокімі заробкамі. Тое, што нашы бацькі давалі нам на кішанёвыя выдаткі, тут было месячным заробкам кіроўцы тралейбуса. Каля курортных гатэляў мы сутыкнуліся з дзятвой, што зарабляла мыццём дарагіх аўто. Кожная спроба спыніцца каля якога «Поршэ», каб разгледзець яго лепей, расцэньвалася як пасягальніцтва на іх невялікі бізнес і сустракалася кулакамі. А ад ракавак рапанаў, выкінутых на бераг штормам, нас ганялі і дарослыя...

Новы год мы сустрэлі на курорце. Большасць дагэтуль не святкавала яго па-за сям'ёй і разгубілася. Найбольш ініцыятыўныя вырашылі адзначаць, нягледзячы ні на што. Так утварыўся аргкамітэт па падрыхтоўцы да навагодніх святкаванняў. Мы набылі колькі пляшак з ліманадам і нават нешта, аддалена падобнае да піцы. Печыва і яблыкі прыносілі з санаторскай сталоўкі.

Чаканне Новага года дало мне першы сур'ёзны ўрок патрыятызму. Калі да падзеі заставалася ўсяго адна гадзіна, у неба паляцелі феерверкі і ракеты. Пачуліся крыкі і свіст. Аднекуль данесліся гукі крамлёўскіх курантаў. І тады нехта з нас здагадаўся, што ў Маскве ўжо наступіў новы 1994 год. Мы раптам адчулі, якая далёкая ў той момант для нас была *нашая* Беларусь. А таксама тое, што праз гадзіну наступіць *наш* Новы год. І калі гэты момант прыйшоў, многія з нас ужо спалі, стол быў разрабаваны. У неба зноў узляцелі ракеты. А мяне не пакідала пачуццё важнасці адкрыцця, падмацаванага займеннікам «наш».




## III. Праблема 2000 і байцоўскі клуб

Новы 2000-ы надыходзіў у атмасферы ўсеагульнай істэрыі з нагоды так званай «праблемы 2000». Калі хто не памятае, тады была папулярнай тэорыя магчымага сусветнага калапсу ў выніку абнулення даты ў камп'ютарных сістэмах. Меркавалася, што камп'ютары па ўсім свеце маглі паблытаць 2000-ы з 1900-м, з прычыны чаго на людзей непазбежна мусілі абрушыцца шматлікія катастрофы. Галівуд, натуральна, праэксплуатаваў папулярную тэму загадзя, скляпаўшы колькі блокбастэраў на тэму зусім не рамантычнай сустрэчы Зямлі з каметамі ды астэроідамі.

Як і перад любым канцом свету, гэты Новы год мы з братам вырашылі сустрэць як апошні. Накупілі спіртнога, прыцягнулі ад сябра стары савецкі прайгравальнік, які і ўключылі на ўвесь гук сярод ночы, вярнуўшыся з навагодняй вечарыны ў вясковым ДК.

Сышоўшыся ў п'яным пога-дэнсе, Паўлюк сутыкнуўся плячом з сябрам. Атрымаў кухталя. Адказаў сябру ўзаемнасцю — заляпіў таму кулаком у плячо. Тое, што пачыналася як сяброўскі жарт, хутка перарасло ў распрананне да пояса і абмен серыямі ўдараў у корпус і галаву.

З дынамікаў хрыпеў хтосьці з беларускіх рокераў. На падлозе, побач з паваленым на бок крэслам, паблісквалі аскепкі ёлачных цацак. Пад сталом з лужыны пралітага піва наталяў прагу Рыжык, наш кот. У той дзень сусед з нейкай прычыны тэрмінова закалоў свінню. Вантробы выкінуў проста за хлявом. За святочны стол Рыжык не прыйшоў, а прыкаціўся. Белая грудка і пакруглелы жывот былі барвовыя. Скажу шчыра: ён вельмі арганічна выглядаў, седзячы на падлозе паміж сябрамі новаадчыненага байцоўскага клуба, што зняможана саплі пабітымі насамі...

А на раніцу свет не скончыўся. Галава, канечне, балела. І не толькі ад начнога бою. Але неба не ўпала на зямлю, а толькі прасыпалася дробным і сухім сняжком. І гэта было галоўнае.

## IV. 2002. Чароўнае імгненне

2002-гі, год-паліндром, я сустракаў у студэнцкім інтэрнаце ў Гродне. Святочнае меню складалася з пачка пельменяў, пляшкі цёмнага піва і кітайскай цыгарылы, набытай у бабуль на адным з гарадскіх рынкаў. Такі мінімалізм тлумачыўся адразу некалькімі прычынамі. У той час мой брат вучыўся на платным курсе, бацькі выплачвалі крэдыт, грошай не хапала. Іх заўсёды не хапала ў настаўніцкай сям'і, але той год быў асабліва цяжкі. Некалькі разоў я дасылаў бацькам са стыпендыі па колькі тысяч да зарплаты. Каб пазней яны дапамаглі мне да чарговай стыпендыі.

Другой прычынай была апатыя пасля чарговых выбараў. Мне наіўна здавалася, што змены вось-вось прыйдуць, але-але...

Мне невыносна было бачыць захопленых навагодняй падрыхтоўкай землякоў, у якіх, як мне здавалася тады, у галаве былі толькі чарка ды шкварка.

Кампанію за навагоднім сталом мне склаў мой сябар, сусед па пакоі. Пельмені мы згатавалі за колькі гадзін да

поўначы — баяліся, што потым ніхто не адчыніць нам кухню. Перажывалі дарэмна, бо нашы суседзі выкруцілі-такі рукі вахцёрцы. Яны гатавалі амаль да самай ночы, наганяючы слінкі пахамі з кухні. З крамы без канца падносіліся «боепрыпасы»: шампанскае, гарэлка, піва. На патэльнях і ў рондалях кіпела і шквірчэла. Суседзі нібы дэманстратыўна сведчылі якасна іншы падыход да сустрэчы новага 2002-га.

Каб не бачыць, не чуць, не нюхаць, мы пайшлі паблукаць па вуліцах. Але гэта толькі ўзмацніла адчуванне прысутнасці на чужым свяце: мы ўвесь час натыкаліся на запозненых пакупнікоў, якія не знайшлі іншага часу набыць пляшку ігрыстага віна, як за дзве гадзіны да Новага года.

Калі да святочнай змены стрэлак засталося хвілін пятнаццаць, мой сябар Віталь пайшоў разагрэць пельмені. У думках я пракручваў ідэю стрэліць піўным коркам, імітуючы адкаркоўванне шампанскага. З кухні данёсся выбух рогату, следам за ім у пакой уваліўся пачырванелы Віталь. Аказалася, што наша святочная вячэра ў чаканні застолля зляпілася ў адзін велізарны пельмень. Мы хуценька перайменавалі яго ў навагодні мясны пірог і падзялілі на дваіх. Віталь дачакаўся першай хвіліны 2002-га і зрабіў мне першы ў гэтым годзе падарунак, прэзентаваўшы сваё піва.

І ўсё ж нам не хапіла цвёрдасці, каб гнуць аскетычную лінію да пераможнага канца. Змучыўшы недагрэты «пірог», мы пайшлі глядзець на святочны салют. На цэнтральнай плошчы сабраўся ладны натоўп. Працяглае сіпенне, глухія выбухі, каляровыя ўспышкі, задаволеныя воклічы натоўпу. Я ўжо не мог супрацьстаяць усеагульнаму настрою, аддаўся ў яго рукі, галёкаў разам з усімі. Кітайская сігарыла ўвесь час тухла, нібы даказваючы, што сапраўды была з Кітая.

Дапальваў яе я на вуліцы Гараднічанскай, калі замусолены недапалак нечакана выпаў з пальцаў. Маю ўвагу прыцягнулі выцінанкі ў старых высокіх вокнах, падсвечаных з сярэдзіны: анёльчыкі, сняжынкі, званочкі. Сюды не даляталі гукі транспарту і крыкі людзей, хоць да плошчы ўсяго хвіліна хады. З пакоя даносілася ціхая музыка, на суседняй вуліцы брахаў сабака. Я ведаў, што ягоны брэх даносіцца з-за недалёкай турэмнай сцяны. Але гэтае веданне парадаксальным чынам не псавала чароўнасці моманту. Ён цягнуўся зусім нядоўга, але яго хапіла, каб я адчуў, што свята, сапраўднае Свята, адбылося. Такое, якое далёка не заўсёды спаткаеш, седзячы за багатым сталом у вялікай кампаніі.

## V. З Новым годам, байцы!

Новы 2004-ы я сустракаў у войску, у навагрудскім радыётэхнічным палку. Ужо гэтым той Новы год быў незвычайны. Тут, у арміі, дзе кожны дзень жывеш клопатам, каб боты былі наваксаваныя, каўнерык адпрасаваны, а ложак акуратна засланы, усе святы ўспрымаюцца не так, як у цывільным жыцці. Справа ў тым, што жыццё салдата тэрміновай службы, як бы добра яму ні служылася, падпарадкаванае адзінаму надзвычай моцнаму жаданню — хутчэй звольніцца ў запас. У чаканні светлага дня салдат адмервае тэрмін, дзелячы яго на кавалкі: ад свята да свята, ад падзеі да падзеі. Таму Новаму году ці дню народзінаў тут найперш радуюцца як чарговаму этапу, які сімвалізуе скарачэнне службы на N-ю колькасць дзён, тыдняў, месяцаў.

Для мяне прыход 2004-га сімвалізаваў не толькі ўласнае 23-годдзе, але найперш тое, што да канца службы засталося 6,5 месяцаў. Да таго часу я ўжо навучыўся жыць адным днём, радавацца простым рэчам, на якія раней амаль не зважаў.

Як бы салдаты ні ставіліся да святаў, а Новы год і ў войску Новы год — за некалькі дзён да яго мы пачалі рыхтаваць святочны стол. Я быў ротным казначэем, таму ў апошні дзень года мяне накіравалі ў горад на закупы. У дапамогу далі двух саслужбоўцаў.

Быў шэры адліжны дзень. Раніцай за вароты выйшлі першыя шчаслівчыкі-дэмбелі. Іншагародніх пагрузілі ў «КАМАЗы», адвезлі на вакзал і рассадзілі на рэйсавыя аўтобусы. Але хлопцы ўсе як адзін павысаджваліся і вярнуліся ў горад адзначаць вяртанне на «гражданку». Іхнія шапкі ды рамяні мы знаходзілі то на гарадской елцы, то проста ў сметніцы. У часць мы вярталіся пад п’яныя спевы выпускнікоў «школы жыцця»...

Каго толькі ні сустрэнеш у войску. Сярод нас апынуўся прафесійны кухар. У той вечар ён атрымаў магчымасць бліснуць талентам, прыгатаваўшы колькі незвычайных салатаў ды сервіраваўшы стол так, каб мы на імгненне забыліся, што знаходзімся ў царстве кірзавых ботаў, квадратнага снегу і вечназялёнага лісця.

У гонар свята прамову галоўнакамандуючага па тэлевізары нам дазволілі глядзець спінай. Я ж апошнія хвіліны 2003-га правёў у сваім кубрыку. Узводны загадаў сяржантам не чапаць мяне («У яго дзень нараджэння, таму Лукашэнку яму глядзець неабавязкова»), а калі прыйшоў Новы год, ён першы павіншаваў мяне з Народзінамі. Наляцелі саслужбоўцы, падхапілі мяне на рукі і пачалі падкідваць пад столь, адлічваючы год за годам. У апошні момант хлопцы разбегліся, пакінуўшы лавіць мяне двух найбольш моцных салдатаў, — гэта такая традыцыя, заклікаmaking завастрыць адчуванні «нованароджанага».

А потым прыйшлі Дзяды Маразы — камандаванне палка. «Ніякага “смірна”, сёння Новы год, хлопцы!» — спыніў днявальнага камандзір палка. «Як справы, байцы? Як настрой? Добра? Тады з Новым годам, байцы, няхай ён будзе добры!» Гэта быў яшчэ адзін невялікі цуд, бо, як расказалі пазней мае сябры, што служылі ў вялікіх часцях, іхнія камандзіры не абцяжарылі сябе віншаваннямі сваіх байцоў.

У тую ноч я задумаўся, ці не напісаць мне пра святкаванне Новага года ў войску ў «Нашу Ніву», якую працягваў чытаць і на службе. Падумаўшы, я зразумеў, што хачу напісаць не толькі пра гэта, а і пра іншыя свае ўражанні ад службы. Свой намер ажыццявіў значна пазней, за тыдзень да звальнення. Гэты ліст фактычна змяніў далейшае маё жыццё. Дзякуючы яму, апублікаванаму на наступны пасля майго звальнення дзень, я быў запрошаны ў «НН», дзе працую дагэтуль. Але гэта ўжо іншая гісторыя.

## Украінскія журналісты звярнуліся з адкрытым лістом да Лукашэнкі

*18 студзеня 2011 года*

«Перашкаджаючы ўсебаковаму асвятленню падзей, якія з'яўляюцца прадметам грамадскай цікавасці, перашкаджаючы шырокай грамадскай дыскусіі па дадзеных пытаннях, улады рэспублікі дэманструюць адкрытую непавагу да ролі сродкаў масавай інфармацыі ў дэмакратычным грамадстве», — гаворыцца ў лісце.

## Камітэт абароны журналістаў заклікаў агентаў КДБ спыніць пераслед незалежных СМІ

*12 студзеня 2011 года*

«Улады павінны неадкладна спыніць гэты працяглы ціск», — заявіла каардынатар еўрапейскай і цэнтральнаазіяцкай праграмы камітэта Ніна Агнянава. У прыватнасці, яна заклікала «агентаў КДБ у Гродне спыніць пераслед Андрэя Пачобута і дазволіць яму працаваць без страху помсты». Агнянава таксама запатрабавала, каб «мінскія ўлады неадкладна вярнулі ўсё абсталяванне, канфіскаванае ў рэдакцыі газеты “Борисовские новости” і ў кватэры яе рэдактара Анатоля Букаса».

## Міжнародны інстытут прэсы заклікае неадкладна вызваліць усіх журналістаў, што былі затрыманыя 19 снежня

*29 снежня 2010 года*

Свабода друку — «гэта фундаментальнае права ва ўсім свеце, і журналісты павінны мець магчымасць выконваць сваю працу без страху арышту, нападу і турэмнага зняволення», — гаворыцца ў сумеснай заяве кіраўніка па пытаннях свабоды друку Міжнароднага інстытута прэсы Энтані Мілса і генеральнага сакратара SEEMO Алівера Вуёвіча.





Photo.bymedia.net